ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Серада 16 лютага 1938 г., № 9 (351).

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

ЛЕНІН АБ „МАНІФЕСЦЕ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ“

«Пытанне аб адносінах соцыял-дэмакратыі ці рабочай дэмакратыі да дэмакратыі буржуазнай ёсць старое і ў той-жа час вечна новае пытанне. Яно старое, таму што пастаўлена з таго самага часу, калі ўзнікла соцыял-дэмакратыя. Яго тэарэтычныя асновы высветлены яшчэ ў самых ранніх творах марксісцкай літаратуры, у «Комуністычным Маніфесце» і ў «Капітале». Яно вечна новае, бо кожны крок у развіцці кожнай капіталістычнай краіны дае асобае, арыгінальнае спалучэнне розных адценняў буржуазнай дэмакратыі і розных плыняў у соцыялістычным руху».

Збор твораў, том VII.—Артыкул «Рабочая і буржуазныя дэмакратыя».

«Галоўнае ў вучэнні Маркса, гэта—высвятленне сусветна-гістарычнай ролі пролетарыята, як стваральніка соцыялістычнага грамадства...

...«Комуністычны Маніфест» Маркса і Энгельса, які выйшаў у 1848 годзе, дае ўжо цэльнае, сістэматычнае, якое да гэтага часу застаецца лепшым, выкладанне гэтага вучэння».

Збор твораў, том XVI.—Артыкул «Гістарычны лёс вучэння Карла Маркса».

«Гэта гістарычнае пісьмо Энгельса аб першым накіду твора, якое абышло ўвесь свет і якое да гэтага часу правільна ва ўсім асноўным, жыва і злабадзённа, быццам-бы яно пісалася ўчора, паказвае наглядна, што імёны Маркса і Энгельса справядліва ставяць побач, як імёны асновапаложнікаў сучаснага соцыялізма».

Збор твораў, том XVII.—Артыкул «Перапіска Маркса з Энгельсам».

«Адзіная «папраўка» да «Комуністычнага Маніфеста», якую палічыў неабходным зрабіць Маркс, была зроблена ім на падставе рэволюцыйнага вопыту парыжскіх комунараў.

Апошняя прадмова да новага нямецкага выдання «Комуністычнага Маніфеста», падпісаная абодвума яго аўтарамі, памечана 24 чэрвеня 1872 года. У гэтай прадмове аўтары, Карл Маркс і Фрыдрых Энгельс, гавораць, што праграма «Комуністычнага Маніфеста» «цяпер месцамі ўстарэла»:

...«У **АСАБЛІВАСЦІ**—прадоўжваюць яны—**КОМУНА ДАВЯЛА, ШТО «РАБОЧЫ КЛАС НЕ МОЖА ПРОСТА АЎЛАДАЦЬ ГАТОВАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ МАШЫНАЙ І ПУСЦІЦЬ ЯЕ У ХОД ДЛЯ СВАІХ УЛАСНЫХ МЭТ»»...**

Узятыя ў другія двукоссі словы гэтай цытаты ўзяты яе аўтарамі з твора Маркса: «Грамадзянская вайна ва Францыі».

Такім чынам, адзін асноўны і галоўны урок Парыжскай Комуны Маркс і Энгельс лічылі маючым такую гіганцкую важнасць, што яны ўнеслі яго, як істотную папраўку да «Комуністычнага Маніфеста».

Надзвычай характэрна, што іменна гэта істотная папраўка была скажона апартуністамі, і сэнс яе, напэўна, невядомы дзевяці дзесятым, калі не дзевяноста дзевяці сотым чытачам «Комуністычнага Маніфеста». Падрабязна аб гэтым скажэнні мы скажам ніжэй, у раздзеле спецыяльна прысвечаным скажэнням. Цяпер дастаткова будзе адзначыць, што хадзячае, вульгарнае «разуменне» прыведзенага намі славутага выказвання Маркса састаіць у тым, быццам Маркс падкрэслівае тут ідэю паступовага развіцця ў супроцьлегласць захопу ўлады і таму падобнае.

На самай справе **ЯКРАЗ НААДВАРОТ.** Думка Маркса састаіць у тым, што рабочы клас павінен **РАЗБІЦЬ, ЗЛАМАЦЬ** «гатовую дзяржаўную машыну», а не абмяжоўвацца простым захопам яе».

Збор твораў, том XXI.—«Дзяржава і рэволюцыя».



ЗАЛАТЫ ФОНД КУЛЬТУРЫ

«Чалавек па натуры сваёй — мастак. Ен усюды так ці інакш імкнецца ўнесці ў сваё жыццё красу», — пісаў Аляксей Максімавіч Горкі, вызначаючы імкненне чалавека да творчасці.

Структура жыцця, пры якой адзін чалавек спажывае працу другога, адзін займае пануючае становішча над другім, не можа стымуляваць шырокія масы народа да стварэння рэчаў характва. У змрочную эпоху капіталізма чалавек мог толькі марыць аб культуры. У сваіх песнях народ аплакваў цяжкае жыццё, праклінаў сваіх прыгнятальнікаў, усхваляў народных герояў.

Асабліва пад'ярэмна жыў беларускі народ, церпячы соцыяльны і нацыянальны ўціск. Беларускі народ стварыў багата песень, казак, у якіх выказаў лютую нянавісць да белапольскіх паноў, царскіх сатрапаў, служак рэлігійных культаў. Капіталістычны лад многім народным талентам не даў расквітнець; яны загінулі, як паўднёвыя кветкі на суровым сібірскім снягу.

Сталінскія пяцігодкі змянілі эканоміку нашай краіны. Соцыялізм увайшоў у быт народа. Савецкі чалавек зусім інакш глядзіць на працу, навуку, мастацтва. Соцыялістычная праца забяспечыла яму ўсе ўмовы для жыцця, творчасці. Беларускаму народу, як і ўсім народам Савецкага Саюза, дзякуючы ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыцы насцеж адкрыты дарогі да святла, навукі, творчасці.

«Пры Сталіне і сонца цяплей грэе», — гаворыць беларускі народ. Гэтая прыказка выключная па сваёй мастацкай сіле і арыгінальнасці.

Сталін! Лепшыя думы і пачуцці свае беларускі народ накіроўвае Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну, творцу сапраўднага жыцця, сапраўднай свабоды для працы і творчасці.

Вобраз Сталіна жыве ў народзе. Народ малюе свайго правадыра самым ласкавым, самым любімым, самым магутным чалавекам.

Што за сонца яснае

Над зямлёй усёй гарыць?

Гэта наш любімы Сталін

Цяпло й шчасце нам дарыць.

Вобраз таварыша Сталіна, настаўніка і друга беларускага народа, адлюстраваны не толькі ў народных песнях і казках. Мастакі-самавучкі, вышывальшчыцы з клапатлівай стараннасцю заносяць рысы правадыра на палатно. Скульптары імкнуцца перадаць яго вобраз у сваіх работах.

Шырокае месца ў народнай творчасці займае тэма героікі грамадзянскай вайны. Беларускія народныя песняры апяваюць гераізм, мужнасць і доблесць нашых бясстрашных палкаводцаў—Варашылава, Будзённага, Блюхера, герояў грамадзянскай вайны — Чапаева, Шчорса, Катоўскага, слаўныя паходы палкоў магутнай Чырвонай Арміі. Гэта гаворыць за тое, што народ любіць сваю родную армію, сваіх легендарных палкаводцаў, гаворыць аб тым, што армія і народ — адзіны.

Асобна вылучаюцца ў народнай творчасці тэмы новага быту, заможнага жыцця, радасці кахання. На гэтыя тэмы народ стварыў шмат песень, частушак, прыказак, адлюстраваў гэта ў сваіх лепках, на палатне, на дрэве.

Такія песні, як «Бывайце здаровы», «Праводзіны», казкі «Чалавек—сонца», «Ленінская праўда», створаныя беларускім народам, ведаюць і выконваюць усе народы неабсяжнага Савецкага Саюза.

Беларускаму народу добра вядомы работы мастакоў-самавучак скульптараў тт. Паварыча, Хруцкага, Каўшэўнага. На выстаўцы народнай творчасці, якая адбылася ў канцы мінулага года, яны атрымалі самую высокую ацэнку ў грамадскасці.

Зробленыя тав. Паварычам фігура А. С. Пушкіна, бюст «Маці» заслугоўваюць самых гарачых водгукаў. У гэтага самародка варта павучыцца нашым скульптарам-прафесіяналам. Работы тав. Каўшэўнага — малюнкі, выкананыя з запалак — карысталіся поспехам не толькі на Усебеларускай, але і Усесаюзнай выстаўцы народнай творчасці.

Казачна багатая і цудоўная творчасць беларускага народа. На беларускай зямлі жывуць заклікаਨыя жыццём да творчай дзейнасці песняры, музыканты, мастакі, скульптары, творцы легенд і казак. Іх творчыя работы ідуць у масы народа, адлюстроўваюць пачуцці і думы народныя.

Беларускі Дом народнай творчасці, заклікаюы ўзначаліць творчую ініцыятыву мас, за апошні час правёў значную работу па паказу народнага мастацтва на выстаўцы «БССР за 20 год». Домам народнай творчасці праведзена алімпіяда мастацкай самадзейнасці. Выяўлены і прыцягнуты да творчай працы шматлікія таленты народа. Але зроблена яшчэ далёка не ўсё. У Дом народнай творчасці штодзённа прыходзяць пісьмы, заявы, просьбы ад мастацкіх самадзейных калектываў. Яны просяць матэрыялу для сваёй работы, просяць дапамогі. Тав. Рубенчык (ДНТ) павінна больш звяртаць увагі і дапамагаць адароным майстрам, беражліва выхоўваць кожнага здольнага чалавека.

Без дапамогі Дом народнай творчасці не зусім можа справіцца са сваімі задачамі. Яму патрэбна дапамога з боку профсаюзаў і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР. Профсаюзныя арганізацыі не дапамагаюць на месцы самадзейным калектывам, не клапоцяцца аб здольных адзінках. Упраўленне па справах мастацтваў зусім выключае з сваіх функцый работу з самадзейнымі мастацкімі гурткамі.

Не зусім добра працуе і фальклорная камісія Акадэміі навук БССР. Каму-ж, калі не гэтай камісіі, трэба сабраць багатую вусную творчасць беларускага народа? Увесну мінулага года спецыяльна для гэтай мэты быў абвешчаны конкурс на лепшага збіральніка фальклора. Прайшоў год. У шафах Акадэміі навук сабралася багата фальклорных матэрыялаў. Выданы толькі адзін няпоўны зборнік народнай творчасці, гэтым работа камісіі і абмежавалася.

Калі збіранне вуснай народнай творчасці так-сяк арганізавана, дык багаты музычны матэрыял амаль зусім не запісваецца. У народзе бытуюць надзвычай прыгожыя, надзвычай арыгінальныя па сваёй музыцы нацыянальныя песні, запеўкі. Якая культурная каштоўнасць! Яе трэба сабраць. Вялікая доля работы ў гэтай галіне прыпадае нашым музычным сілам, нашым кампазітарам.

Беларускія нацыяналісты ўсяляк фальсіфікавалі народную творчасць. Яны адмаўлялі, што ў вуснай творчасці народа пануюць соцыяльныя матывы, ставілі мастацкае слова народа толькі за ўзор арыгінальнасці формы і самабытнай прыгожасці. Гэта чамусьці зусім абмінута нашай літаратурнай крытыкай, якая, дарэчы, пытаннем фальклору не займаецца зусім.

Мала вывучаюць багаты фальклорны матэрыял нашы пісьменнікі. А. М. Горкі неаднаразова рэкамендаваў пісьменнікам: «Збірайце ваш фальклор, вучыцеся на ім, апрацоўвайце яго».

У маскоўскіх літаратурных выдавецтвах нярэдка выходзяць кнігі ў афармленні народных майстроў кісці — мастакоў Палеха, Мсцеры і інш. Нашы мастакі-самавучкі да такой работы не прыцягнуты. Аб іх выдавецтва, бадай, і не чула. Больш таго, выдавецтва Акадэміі навук і Белдзяржвыдавецтва з неахвотай бяруцца друкаваць народную творчасць.

Народная творчасць праяўляецца ў кожным кутку краіны. Яна мае шматлікія жанры і формы. Народныя дараванні, сагрэтыя сталінскім сонцам, як маладыя парасткі, цягнуцца да жыцця, да творчасці. На ўсебеларускай алімпіядзе мастацкай самадзейнасці мы былі сведкамі таго, як узрасла творчая актыўнасць народных мас. Жанчыны-калгасніцы, сівабародыя дзяды, дзяўчаты, усе яны імкнуцца паказаць свае здольнасці, свае дасягненні ў мастацтве. Асаблівы поспех у нашых тэатральных самадзейных калектываў. У такіх калектывах ёсць людзі, якія прэтэндуюць быць акторамі прафесіянальных тэатраў.

Самадзейныя драмкалектывы адчуваюць вялікі недахоп у рэпертуары. Людзі за п'есамі прыязджаюць у Менск. Але простых, пасільных самадзейнікам п'ес няма. Беларускія драматургі ў даўгу перад самадзейным драматычным мастацтвам. Аплаціць гэты доўг — напісаць для самадзейных гурткоў новыя драматычныя творы — абавязак пісьменнікаў.

Праведзеная алімпіяда паказала, што сталіцы БССР трэба мець Тэатр народнай творчасці. Лепшыя самадзейныя акторы, музыканты, спевакі змаглі-б тут прыкласці свае здольнасці, павысіць сваю тэатральную альбо музычную культуру.

Народная творчасць — залаты фонд нашай соцыялістычнай культуры. Берагчы гэты фонд, дамагчыся, каб ні адно зерне гэтага фонда не прапала—задача, якую ўскладае на нас гісторыя, за якую будуць дзякаваць нас пакаленні наступных вякоў — эпохі поўнага комунізма.

Бессмяротная праграма комунізма

Дзевяноста год назад выйшаў «Маніфест комуністычнай партыі». У гэтым геніяльным творы Маркс і Энгельс выклалі асновы свайго вучэння ў форме праграмы першай у свеце комуністычнай партыі пролетарыята.

Над светам, сціснутым піскамі капіталістычнага рабства, упершыню ўзвіўся неперамажны чырвоны сцяг навуковага комунізма. З таго часу імклівы бег гісторыі ўсё зноў і зноў пацвярджае правату гэтага вялікага вучэння. Ніколі яшчэ ўсесільная праўда марксавых ідэй неззяла так ярка і пераможна, як у нашы дні, у сталінскую эпоху найвялікшай урачыстасці соцыялізма ў нашай краіне, у эпоху тытанічнай барацьбы двух сістэм — соцыялізма і капіталізма. «Маніфест» састаіць на ўзбраенні кожнага змагара за справу комунізма. Кожны, хто імкнецца авалодаць большэвізмам, павінен чытаць і перачытваць яго палкія радкі.

«Маніфест» нарадзіўся ў рэволюцыйнае прадбур'е 1848 года. Некалькі месяцаў пасля рабочы клас на вуліцах Парыжа ўпершыню патрабаваў свайго вызвалення грамавым голасам ўзброенага паўстання. Але капіталізму яшчэ прадстаялі дзесяцігоддзі жыцця. Патрэбна была ўся геніяльнасць творцоў навуковага комунізма, каб скрозь заслону дзесяцігоддзяў угледзець непазбежны лёс буржуазнага грамадства.

Абагуліўшы тысячагадовы вопыт барацьбы эксплаатуемых супроць эксплаататараў, Маркс і Энгельс сарвалі крывадушныя пакровы з свету капітала. Гэты свет прадстаў ва ўсёй аголенасці з сваімі грамадскімі адносінамі, дзяржаўным ладам, формамі ўласнасці, сям'і, ілжывай мараллю і воўчымі законамі чалавечага сужыцця. Але Маркс і Энгельс паказалі, што капіталізм параджае пролетарыят, які разам з яго развіццём расце ў колькасці, пранізваецца ўсведамленнем сваёй сілы, загартоўваецца ў сваёй рашучасці. Яго перамога, гэтак-жа немінучая, як і гібель буржуазіі, нясе канчатковае выкарчаванне ўсякай эксплаатацыі чалавека чалавекам. Пагэтаму пролетарыят — прызваны правадыр усіх працоўных у іх барацьбе за сваё вызваленне.

«Маніфест» агаласіў вялікае сусветна-гістарычнае прызванне пролетарыята, як магільшчыка капіталізма і стваральніка новага, комуністычнага грамадства. Няма іншага шляху для ажыццяўлення комунізма, апрача дыктатуры рабочага класа. Пролетарыяту прадстаіць заваяваць яе ў агні найвялікшай рэволюцыі. Для гэтага яму патрэбна комуністычная партыя, аб'ядноўваючая авангард рабочага класа, краса яго, моцная адзінствам волі і дзеяння, бязлітасная да ўсіх ворагаў працоўных.

Росквіт капіталізма змяніўся яго заняпадам. У эпоху імперыялізма і пролетарскай рэволюцыі вялікае марксава вучэнне было развіта, узбагачана і ўзнята на новую, вышэйшую ступень Леніным і Сталіным. Яны разграмілі агідных здраднікаў, якія прабавалі ператварыць самае дзейснае і жыццёздольнае вучэнне, якое калі-небудзь існавала ў гісторыі чалавецтва, у мумію, няздольную да развіцця. Геніяльнае ленінскае адкрыццё аб магчымасці пабудовы соцыялізма ў адной, асобна ўзятай краіне, распрацаванае таварышам Сталіным і ператворанае ў жыццё пад яго кіраўніцтвам, дало ў рукі рабочага класа неперамажную зброю ў абстаноўцы, калі соцыялістычная рэволюцыя непасрэдна стала ў парадак дня.

У тварэннях Леніна і Сталіна, у справах створанай імі партыі большэвікоў ідэі «Маніфеста» сталі неперамажнай сілай у эпоху нараджэння новага свету. Партыя Леніна — Сталіна ажыццявіла справу жыцця Маркса і Энгельса. Яна павяла рабочы клас нашай краіны на штурм цвярдынь капіталізма. Вялікая соцыялістычная рэволюцыя ўмацавала пераможны сцяг дыктатуры рабочага класа над шостай часткай свету.

Адмятаючы злобнае крумканне ворагаў, рабочы клас пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, цвёрдай рукой ведучы да заветнай мэты шматмільённае сялянства, пабудаваў соцыялізм у нашай краіне.

За 20 год савецкай улады соцыялізм атрымаў велізарнейшыя сусветна-гістарычныя перамогі ў нашай краіне. Ен моцна і непахісна ўвайшоў у быт нашай радзімы. Шчаслівае соцыялістычнае жыццё стала вялікай рэальнасцю нашых дзён.

Ідэі «Маніфеста» гучаць урачыстым гімнам вызваленай працы ў найвялікшым дакуменце перамогшага соцыялізма — Сталінскай Канстытуцыі. Тое, што там было праграмай нешматлікага авангарду перадавога класа, тут замацавана і запісана ў якасці непарушнага закона шчаслівага і свабоднага жыцця дзесяткаў мільёнаў людзей. Тое, што там было абвешчана мэтай барацьбы, тут стала велічным вынікам упартай будоўчай работы.

«Адрозніваючай рысай комунізма з'яўляецца не адмяненне ўласнасці наогул, а адмяненне буржуазнай уласнасці». Гэтыя словы «Маніфеста» жывуць новым жыццём у артыкулах Сталінскай Канстытуцыі, якія сцвярджаюць соцыялістычную ўласнасць як непахісную аснову нашага грамадства, у якім назаўсёды знішчана ўсякая эксплаатацыя чалавека чалавекам.

Духоўнаму позірку творцоў «Маніфеста» ўяўляўся лад, дзе «свабоднае развіццё кожнага з'яўляецца ўмовай свабоднага развіцця ўсіх». Нябачаны рост людзей, гераізм, які ўвайшоў у быт, культурны ўздым мас, росквіт мастацтва і навуковай творчасці—у незлічоных фактах нашай шматкаляровай рэчаіснасці ўвасабляецца гэта прарочае прадбачанне. Яно набыло плоць і кроў у артыкулах Сталінскай Канстытуцыі, якія ўпершыню ў гісторыі агаласілі рэальныя правы свабоднага працаўніка соцыялістычнага грамадства.

«У той-жа ступені, у якой будзе скасавана эксплаатацыя аднаго індывідуума другім, будзе скасавана і эксплаатацыя адной нацыі другой».

Гэты завет «Маніфеста» занесен на скрыжалі Сталінскай Канстытуцыі ў выглядзе непахіснага закона, які сцвярджае поўнае роўнапраўе ўсіх нацый і рас, якія насяляюць СССР. Ен жыве ў вялікай сталінскай дружбе народаў нашай шматнацыянальнай радзімы.

Квітнеючая краіна соцыялізма ўзвышаецца непрыступным ўцёсам сярод акіяна бруду і крыві, у якім захлёбваецца капіталізм. Да нашай радзімы павернуты надзеі і спадзяванні працоўных усяго свету, усіх лепшых сыноў чалавецтва. Няхай шалеюць крывавыя жартаўнікі фашысцкай буржуазіі, хвастаючы «знішчэннем комунізма»: гэта ім удасца не ў большай меры, чым удалося-б асепленым вар'ятам спыніць рух зямлі вакол сонца. І няхай паракаюць на сябе фашысцкія ўладары, калі ў авантурысцкім чадзе яны выпрашаць выпрабаваць непрыступнасць нашых граніц: краіна, дзе народ і комунізм злучаны ў адно цэлае, акажа фашысцкім разбойнікам такі адпор, ад якога яны скоцяцца ў даўно прыгатаваную для іх гісторыяй магілу.

«...Комуністы дамагаюцца ўсюды аб'яднання і згуртавання дэмакратычных партый усіх краін». Гэты завет «Маніфеста» жыве ў барацьбе ўсіх комуністычных партый. У Іспаніі комуністы згуртоўваюць народ на абарону свабоды ад германа-італьянскіх інтэрвентаў і іх лакея Франко. У Кітаі комуністы ідуць на чале ўсенароднага адпору прагным шакалам японскага імперыялізма. Ва ўсім свеце комуністы згуртоўваюць дэмакратычныя сілы для адпору фашысцкім катам, змацоўваючы сваёй крывёю бар'ер, аб які разбіваюцца мутныя хвалі фашызма.

Над усёй нашай планетай ляціць баявы заклік «Маніфеста».

— Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

У сэрцах дзесяткаў і соцень мільёнаў жыве гэты палкі заклік да барацьбы і перамогі. Ен гучыць у нашу эпоху заклікам ажыццявіць усюды тое, што ажыццёўлена ў СССР, заклікам да канчатковай урачыстасці комунізма на ўсім свеце.

(«ПРАВДА»).



Смерць Шчорса. З карціны мастака Н. Карпоўскага.

Фотарэпрадукцыя С. Шыманскага (СФ).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ПІСЬМО тав. ІВАНОВА І АДКАЗ тав. СТАЛІНА

Таварышу СТАЛІНУ

Ад штатнага прапагандыста РК ВЛКСМ Мантураўскага раёна, Курскай вобласці, Іванова Івана Філіпавіча

Дарагі таварыш Сталін, перакана́ўча прашу растлумачыць мне наступнае пытанне: У нас на месцах, ды і ў абкоме комсамола ёсць двоякае разуменне аб канчатковай перамозе соцыялізма ў нашай краіне, г. значыць, блытаюць першую групу супярэчнасцей з другой. У Вашых працах—аб лёсах соцыялізма ў Совецкім Саюзе ідзе гутарка аб двух групах супярэчнасцей — аб унутраных і знешніх.

Аб першай групе супярэчнасцей зразумела, што мы іх вырашылі—соцыялізм унутры краіны перамог.

Я хачу атрымаць адказ аб другой групе супярэчнасцей, гэта значыць, паміж краінай соцыялізма і капіталізма. Вы ўказваеце, што канчатковая перамога соцыялізма азначае вырашэнне знешніх супярэчнасцей, мае поўную гарантыю ад інтэрвенцыі, а значыць ад рэстаўрацыі капіталізма. А гэта група супярэчнасцей вырашыма толькі намаганнямі рабочых усіх краін.

Так, і тав. Ленін вучыў нас—«Канчаткова перамагчы можна толькі ў сусветным маштабе, толькі сумеснымі намаганнямі рабочых усіх краін».

Будучы на семінары штатных прапагандыстаў у абкоме ВЛКСМ, я, грунтуючыся на Вашых працах, сказаў, што канчатковая перамога соцыялізма можа быць у сусветным маштабе, але абкомаўскія работнікі—Уражэнка (першы сакратар абкомола) і Казелкоў (інструктар па прапагандзе) маё выступленне кваліфікуюць, як трацкісцкую вылазку.

Я стаў ім зачытваць цытаты з Вашых прац па гэтаму пытанню, але Уражэнка прапанаваў мне закрыць трохтомнік, выказаўшы, што «таварыш Сталін гаварыў у 1926 г., а мы ўжо маем 1938 г., тады мы не мелі канчатковую перамогу, а цяпер маем, і нам цяпер думаць аб інтэрвенцыі і рэстаўрацыі ніяк не трэба»; далей, ён гаворыць — «мы цяпер маем канчатковую перамогу соцыялізма і маем поўную гарантыю ад інтэрвенцыі і рэстаўрацыі капіталізма». Ітак, мяне палічылі пасобнікам трацкізма, знялі з прапагандысцкай работы і паставілі пытанне аб прабыванні ў комсамоле.

Прашу, таварыш Сталін, растлумачыць — ці маем мы канчатковую перамогу соцыялізма, ці пакуль яшчэ не? Можа быць я яшчэ не знайшоў дадатковага сучаснага матэрыялу па гэтаму пытанню ў сувязі са зменамі сучаснасці.

Я таксама лічу заяву Уражэнка антыбольшэвіцкай, што працы таварыша Сталіна па гэтаму пытанню крыху ўстарэлі. І ці правільна паступілі работнікі абкома, палічыўшы мяне трацкістам. Гэта для мяне вельмі крыўдна і зняважліва.

Прашу, таварыш Сталін, не адмоўце ў просьбе і дайце адказ па адрасу — Мантураўскі раён, Курскай вобласці, 1-ы Засемскі сельсовет, Іванову Івану Філіпавічу.

І. ІВАНОЎ.

18 студзеня 1938 г.

Адказ т-шу Іванову Івану Філіпавічу

Вы, вядома, правы, тав. Іваноў, а Вашы ідэйныя праціўнікі, гэта значыць, таварышы Уражэнка і Казелкоў—не правы.

І вось чаму.

Несумненна, што пытанне аб перамозе соцыялізма ў адной краіне, у даным выпадку, у нашай краіне — *мае дзве розныя* стараны.

Першая старана пытання аб перамозе соцыялізма ў нашай краіне абнімае праблему ўзаемаадносін класаў унутры нашай краіны. Гэта — галіна *ўнутраных* адносін. Ці можа рабочы клас нашай краіны перамагчы супярэчнасці з нашым сялянствам і наладзіць з ім саюз, супрацоўніцтва? Ці можа рабочы клас нашай краіны ў саюзе з нашым сялянствам разбіць буржуазію нашай краіны, адабраць у яе зямлю, заводы, шахты і т. п. і пабудаваць сваімі сіламі новае бясклясавае грамадства, поўнае соцыялістычнае грамадства?

Такавы праблемы, звязаныя з *першай* стараной пытання аб перамозе соцыялізма ў нашай краіне.

Ленінізм адказвае на гэтыя праблемы станоўча. Ленін вучыць, што *«мы маем усё неабходнае для пабудовы поўнага соцыялістычнага грамадства»*. Стала быць, мы можам і павінны ўласнымі сіламі перамагчы сваю буржуазію і пабудаваць соцыялістычнае грамадства. Троцкі, Зіноўеў, Каменеў і іншыя паны, стаўшыя потым шпіёнамі і агентамі фашызма, адмаўлялі магчымасць пабудовы соцыялізма ў нашай краіне без папярэдняй перамогі соцыялістычнай рэволюцыі ў іншых краінах, у капіталістычных краінах. Гэтыя паны па сутнасці справы хацелі павярнуць нашу краіну назад, на шлях буржуазнага развіцця, прыкрываючы сваё адступніцтва фальшывымі спасыланнямі на «перамогу рэволюцыі» ў іншых краінах. Аб гэтым іменна і ішлі спрэчкі ў нашай партыі з гэтымі панамі. Далейшы ход развіцця нашай краіны паказаў, што партыя была права, а Троцкі і кампанія былі не правы. Бо за гэты час мы паспелі ўжо ліквідаваць сваю буржуазію, наладзіць брацкае супрацоўніцтва са сваім сялянствам і пабудаваць у асноўным соцыялістычнае грамадства, не гледзячы на адсутнасць перамогі соцыялістычнай рэволюцыі ў іншых краінах.

Так стаіць справа з *першай* стараной пытання аб перамозе соцыялізма ў нашай краіне.

Я думаю, тав. Іваноў, што Вашы спрэчкі з тт. Уражэнка і Казелковым датычаць не гэтай стараны пытання.

Другая старана пытання аб перамозе соцыялізма ў нашай краіне абнімае праблему ўзаемаадносін нашай краіны з іншымі краінамі, з капіталістычнымі краінамі, праблему ўзаемаадносін рабочага класа нашай краіны з буржуазіяй іншых краін. Гэта — галіна *знешніх, міжнародных* адносін.

Ці можа перамогшы соцыялізм адной краіны, які мае ў акружэнні мноства моцных капіталістычных краін, лічыць сябе зусім гарантаваным ад небяспекі ваеннага ўтаржэння (інтэрвенцыі), і, стала быць, ад спроб аднаўлення капіталізма ў нашай краіне? Ці могуць наш рабочы клас і наша сялянства ўласнымі сіламі, без сур'ёзнай дапамогі рабочага класа капіталістычных краін, перамагчы буржуазію іншых краін таксама, як яны перамаглі сваю буржуазію? Інакш гаворачы: ці можна лічыць перамогу соцыялізма ў нашай краіне канчатковай, гэта значыць, свабоднай ад небяспекі ваеннага нападу і спроб аднаўлення капіталізма, пры ўмове, што перамога соцыялізма ёсць толькі ў адной краіне, а капіталістычнае акружэнне прадаўжае існаваць?

Такавы праблемы, звязаныя з *другой* стараной пытання аб перамозе соцыялізма ў нашай краіне.

Ленінізм адказвае на гэтыя праблемы адмоўна. Ленінізм вучыць, што «канчатковая перамога соцыялізма ў сэнсе поўнай гарантыі ад рэстаўрацыі буржуазных адносін магчыма толькі ў міжнародным маштабе» (гл. вядомую рэзалюцыю XIV канферэнцыі ВКП). Гэта значыць, што сур'ёзная дапамога міжнароднага пролетарыята з'яўляецца той сілай, без якой не можа быць вырашана задача канчатковай перамогі соцыялізма ў адной краіне. Гэта, вядома, не значыць, што мы самі павінны сядзець, склаўшы рукі, у чаканні дапамогі звонку. Наадварот, дапамога з боку міжнароднага пролетарыята павінна быць злучана з нашай работай па ўзмацненню абароны нашай краіны, па ўзмацненню Чырвонай арміі і Чырвонага флота, па мабілізацыі ўсёй краіны на барацьбу з ваенным нападам і спробамі рэстаўрацыі буржуазных адносін.

Вось што гаворыць наконт гэтага Ленін:

> «Мы жывем не толькі ў дзяржаве, але і ў *сістэме дзяржаў*, і існаванне Совецкай рэспублікі побач з імперыялістычнымі дзяржавамі працяглы час нямысліма. Урэшце або адно, або другое пераможа. А пакуль гэты канец наступіць, рад самых жахлівых сутычак паміж Совецкай рэспублікай і буржуазнымі дзяржавамі немінучы. Гэта значыць, што пануючы клас, пролетарыят, калі толькі ён хоча і будзе панаваць, павінен даказаць гэта і сваёй ваеннай арганізацыяй» (т. XXIV, стар. 122).

І далей:

> «Мы акружаны людзьмі, класамі, урадамі, якія адкрыта выражаюць нянавісць да нас. Трэба памятаць, што ад усякага нашэствія мы заўсёды на валаску» (т. XXVII, стар. 117).

Сказана востра і моцна, але чэсна і праўдзіва, без прыкрас, як умеў гаварыць Ленін.

На аснове гэтых прадпасылак у «Пытаннях ленінізма» Сталіна было сказана:

> «Канчатковая перамога соцыялізма ёсць поўная гарантыя ад спроб інтэрвенцыі, а, значыць, і рэстаўрацыі, бо колькі-небудзь сур'ёзная спроба рэстаўрацыі можа мець месца толькі пры сур'ёзным падтрыманні звонку, толькі пры падтрыманні міжнароднага капітала. Таму падтрыманне нашай рэволюцыі з боку рабочых усіх краін, а тым больш перамога гэтых рабочых хаця-б у некалькіх краінах, з'яўляецца неабходнай умовай поўнай гарантыі першай перамогшай краіны ад спроб інтэрвенцыі і рэстаўрацыі, неабходнай умовай канчатковай перамогі соцыялізма» («Пытанні ленінізма», 1937 г., стар. 134).

На самой справе было-б смешна і глупа закрываць вочы на факт капіталістычнага акружэння і думаць, што нашы знешнія ворагі, напрыклад, фашысты не паспрабуюць пры выпадку зрабіць на СССР ваенны напад. Так могуць думаць толькі сляпыя бахвалы або скрытыя ворагі, якія жадаюць усыпіць народ. Не менш смешна было-б адмаўляць, што ў выпадку малейшага поспеху ваеннай інтэрвенцыі інтэрвенты паспрабуюць разбурыць у занятых імі раёнах совецкі лад і аднавіць буржуазны лад. Хіба Дзенікін або Калчак не аднаўлялі ў занятых імі раёнах буржуазны лад? Чым фашысты лепш Дзенікіна або Калчака? Адмаўляць небяспеку ваеннай інтэрвенцыі і спроб рэстаўрацыі пры існаванні капіталістычнага акружэння могуць толькі галавацяпы або скрытыя ворагі, якія жадаюць прыкрыць бахвальствам сваю варожасць і стараюцца дэмабілізаваць народ. Але ці можна лічыць перамогу соцыялізма ў адной краіне канчатковай, калі гэта краіна мае вакол сябе капіталістычнае акружэнне і калі яна не гарантавана поўнасцю ад небяспекі інтэрвенцыі і рэстаўрацыі? Ясна, што нельга.

Так абстаіць справа з пытаннем аб перамозе соцыялізма ў адной краіне.

Выходзіць, што пытанне гэта мае дзве розныя праблемы: а) праблему *ўнутраных* адносін нашай краіны, гэта значыць праблему перамагання сваёй буржуазіі і пабудовы поўнага соцыялізма, і б) праблему *знешніх* адносін нашай краіны, гэта значыць праблему поўнага забеспячэння нашай краіны ад небяспек ваеннай інтэрвенцыі і рэстаўрацыі. Першая праблема ўжо вырашана намі, таму што наша буржуазія ўжо ліквідавана і соцыялізм ужо пабудаван у асноўным. Гэта называецца ў нас перамогай соцыялізма, або дакладней, перамогай соцыялістычнага будаўніцтва ў адной краіне. Мы маглі-б сказаць, што гэта перамога з'яўляецца канчатковай, калі-б наша краіна знаходзілася на востраве і калі-б вакол яе не было мноства іншых, капіталістычных краін. Але таму што мы жывем не на востраве, а «ў сістэме дзяржаў», значная частка якіх варожа адносіцца да краіны соцыялізма, ствараючы небяспеку інтэрвенцыі і рэстаўрацыі, то мы гаворым адкрыта і чэсна, што перамога соцыялізма ў нашай краіне не з'яўляецца яшчэ канчатковай. Але з гэтага вынікае, што другая праблема пакуль не вырашана і яе прыдзецца яшчэ вырашыць. Больш таго: другую праблему немагчыма вырашыць у тым-жа парадку, у якім вырашылі першую праблему, гэта значыць шляхам толькі ўласных намаганняў нашай краіны. Другую праблему можна вырашыць толькі ў парадку злучэння сур'ёзных намаганняў міжнароднага пролетарыята з яшчэ больш сур'ёзнымі намаганнямі ўсяго нашага совецкага народа. Трэба ўзмацніць і ўмацаваць інтэрнацыянальныя пролетарскія сувязі рабочага класа СССР з рабочым класам буржуазных краін; трэба арганізаваць палітычную дапамогу рабочага класа буржуазных краін рабочаму класу нашай краіны на выпадак ваеннага нападу на нашу краіну, роўна як арганізаваць усякую дапамогу рабочага класа нашай краіны рабочаму класу буржуазных краін; трэба ўсямерна ўзмацніць і ўмацаваць нашу Чырвоную армію, Чырвоны флот, Чырвоную авіяцыю, Асоавіяхім. Трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку...

З Вашага пісьма відаць, што т. Уражэнка трымаецца іншых, не зусім ленінскіх поглядаў. Ён, аказваецца, сцвярджае, што «мы цяпер маем канчатковую перамогу соцыялізма і маем поўную гарантыю ад інтэрвенцыі і рэстаўрацыі капіталізма». Не можа быць сумнення, што тав. Уражэнка ў корані не праў. Такое сцвярджэнне т. Уражэнка можа быць растлумачана толькі неразуменнем акружаючай сапраўднасці і няведаннем элементарных палажэнняў ленінізма, або пустапарожнім хвастаўствам зазнаўшагася маладога чыноўніка. Калі мы на самой справе «маем поўную гарантыю ад інтэрвенцыі і рэстаўрацыі капіталізма», то ці патрэбны нам пасля гэтага моцная Чырвоная армія, Чырвоны флот, Чырвоная авіяцыя, моцны Асоавіяхім, узмацненне і ўмацаванне інтэрнацыянальных пролетарскіх сувязей? Ці не лепш будзе мільярды грошай, якія ўходзяць на ўзмацненне Чырвонай арміі, звярнуць на іншыя патрэбы, а Чырвоную армію скараціць да мінімума, або нават распусціць зусім? Такія людзі, як т. Уражэнка, калі яны суб'ектыўна нават адданы нашай справе, аб'ектыўна небяспечны для нашай справы, бо яны сваім хвастаўствам вольна або нявольна (гэта ўсёроўна!) усыпляюць наш народ, дэмабілізоўваюць рабочых і сялян і дапамагаюць ворагам засцігнуць нас знянацку ў выпадку міжнародных ускладненняў.

Што датычыць таго, тав. Іваноў, што Вас, аказваецца, «знялі з прапагандысцкай работы і паставілі пытанне аб прабыванні ў комсамоле», то апасацца Вам гэтага не варта. Калі людзі з абкома ВЛКСМ сапраўды захочуць упадобіцца чэхаўскаму ўнтэр-афіцэру Прышыбееву, можна не сумнявацца, што яны прайграюць на гэтым. У нашай краіне не любяць прышыбеевых.

Цяпер Вы можаце судзіць, ці ўстарэла вядомае месца з кнігі «Пытанні ленінізма» па пытанню аб перамозе соцыялізма ў адной краіне. Я сам-бы вельмі хацеў, каб яно ўстарэла, каб не было больш на свеце такіх непрыемных рэчаў, як капіталістычнае акружэнне, небяспека ваеннага нападу, небяспека рэстаўрацыі капіталізма і т. п. Але, на жаль, гэтыя непрыемныя рэчы ўсё яшчэ прадаўжаюць існаваць.

І. СТАЛІН.

12 лютага 1938 г.

(«ПРАВДА»).

НАПЯРЭДАДНІ XX ГАДАВІНЫ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА



Серго Орджанікідзе ў разведцы пад Барысавам. Карціна мастака Е. Н. Ціхановіча. Фотарэпрадукцыя Каплінскага.

ХВАЛЮЮЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ

(На выстаўцы, прысвечанай XX гадавіне Чырвонай Арміі)

13 лютага ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя Леніна адкрылася выстаўка літаратуры і фотаілюстрацый, прысвечаная XX гадавіне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Шэсць асноўных раздзелаў, у якіх сабраны кнігі, фотаздымкі, копіі з карцін і дакументаў, уяўляюць шмат цікавага для азнаямлення нашай моладзі з гісторыяй і жыццём гераічнай Чырвонай Арміі. У больш старэйшага пакалення выстаўка абуджае хвалюючыя ўспаміны аб незабыўных днях, калі пад кіраўніцтвам сталёвай партыі большэвікоў, на чале з геніяльнымі правадырамі працоўных, Леніным і Сталіным, народныя масы скінулі ненавісны царскі рэжым, уладу памешчыкаў і капіталістаў і самі пачалі кіраваць сваёй краінай і сваім жыццём.

Вялікія перамогі Чырвонай Арміі ў барацьбе з сусветным імперыялізмам, з ворагамі народаў Совецкага Саюза, вялікія яе заслугі ў справе ўмацавання абараназдольнасці краіны. І выстаўка ў бібліятэцы імя Леніна з'яўляецца яркай ілюстрацыяй гэтых перамог і заслуг.

...Нараджэнне Чырвонай Арміі было прадвызначана ўсёй гісторыяй развіцця рэволюцыйнага руху, усёй тытанічнай работай большэвіцкай партыі ў годы падполля і ў дні пераможнай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Спецыяльны раздзел выстаўкі прысвечан геніяльным выказванням Маркса, Энгельса, Леніна, Сталіна аб узброеным паўстанні пролетарыята. Гэтыя геніяльныя прадбачанні хутка збыліся.

... Імперыялістычная вайна. Велізарныя афяры народа ў імя ўзбагачэння кучкі капіталістаў і памешчыкаў. Мільёны забітых і параненых. Велізарны рост выдаткаў на вайну. Неўзараныя і непрыбраныя палі. Голад. Сяляне руйнуюць і падпальваюць памешчыцкія маёнткі, захапляюць зямлю і інвентар. Скупая мова дыяграм быццам пражэктарам асвятляе безвыходнае становішча 160-мільённага народа, заціснутага ў ціскі ваеннай машынай. Дзе выхад з гэтага становішча? Гэты выхад указваюць большэвікі. Ленін і Сталін клічуць да рэволюцыі, да нізвяржэння ненавіснага царскага рэжыму. Рабочыя на заводах, салдаты ў акопах, сяляне ў разбураных вёсках з надзеяй слухаюць гэтыя заклікі і рыхтуюцца да рэволюцыйных баёў.

«Лютаўскія дні 1917 года» — фота з карціны мастака Кузняцова. Грузавік, з усіх бакоў аблеплены рэволюцыйнымі і ўзброенымі салдатамі. Пасведчанне — аб абранні таварыша Сталіна прадстаўніком Цэнтральнага Камітэта партыі большэвікоў у Выканаўчы камітэт Петраградскага Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў (сакавік 1917 года). Артыкул таварыша Сталіна «Аб советах рабочых і салдацкіх дэпутатаў» у 8-м нумары «Праўды» ад 27 (14) сакавіка 1917 года. Артыкул Леніна — «Аб задачах пролетарыята ў данай рэволюцыі» у 26-м нумары «Праўды» за 20 (7) сакавіка 1917 года. Рэпрадукцыя вядомай карціны «Ленін гаворыць прамову з броневіка ля Фінляндскага вакзала». Фота — В. І. Ленін на Усерасійскай канферэнцыі РСДРП(б) у сакавіку 1917 года. Малюнак Н. Паўлава «Сакавіцкія дні ў Петраградзе. Рабочая дэманстрацыя». Дэманстрацыя рэволюцыйных маракоў. Дадатак да газеты «Солдатская правда» — рэзалюцыі Усерасійскай канферэнцыі РСДРП(б). Адозва ЦК РСДРП (большэвікоў). Рэпрадукцыя з карціны — Ленін, Сталін і Кагановіч на Усерасійскай канферэнцыі франтавых і тылавых арганізацый РСДРП(б) у чэрвені 1917 года. Фото—Ленін на першым Усерасійскім з'ездзе сялянскіх дэпутатаў. Фота — Ленін на першым з'ездзе рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Ленін, Сталін і Молатаў у рэдакцыі газеты «Правда» (1917 г.)...

У дакументах, фота-ілюстрацыях, рэпрадукцыях, як на кіноэкране, разгортваецца падрыхтоўка пераможнага ўзброенага паўстання... Салдаты ў акопах чытаюць большэвіцкія газеты. Пісьмы з фронта. Ліпеньская дэманстрацыя ў Петраградзе. Здрадніцкі расстрэл тысяч няўзброеных людзей. Афорт — кулямётчыкі заклікаюць рабочых Пуцілаўскага завода падтрымаць наступленне супроць часовага ўрада. Рэпрадукцыя карціны Драздова: дэсант рэволюцыйных маракоў, якія прыбылі ў Петраград з Кранштата. «Ленін у Разліве» — з карціны Сокалава. Фотакопія рукапісу: рэзалюцыя аб узброеным паўстанні, унесеная Леніным.

... Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэвалюцыя. Атака Чырвонай гвардзіяй Зімняга Палаца. Першыя атрады чырвонагвардзейцаў... Нараджэнне Чырвонай Арміі.

Тры паходы Антанты. Разгром Юдзеніча, Калчака, Дзенікіна, белапольскіх банд, Врангеля. Вызваленне Далёкага Усхода ад японскіх драпежнікаў.

Фурманаў — «Чапаеў», «Мяцеж», Н. Остроўскі — «Народжаныя бурай», Герасімаў і Эрліх — «Шчорс», Серафімовіч — «Жалезны паток», А. Марці — «Чырвоны сцяг над французскім флотам», Паўленка—«На Усходзе» і г. д.— сотні кніг, прысвечаных грамадзянскай вайне, Чырвонай Арміі і яе героям.

Батальныя карціны лепшых мастакоў — Перакоп, Валачаеўка, прарыў белапольскага фронта конніцай Будзённага, Чапаеў у баю, разгбраенне калчакоўцаў у Краснаярску, абарона Царыцына...

Перад вачыма гледача ўсплываюць незабыўныя дні, калі маладая Чырвоная Армія, дрэнна ўзброеная, шкадуючы кожны снарад і патрон, граміла добра ўзброеныя капіталістычнымі драпежнікамі белагвардзейскія полчышчы і легіёны інтэрвентаў, граміла і разграміла ўсіх па чарзе, ачысціўшы свяшчэнную совецкую зямлю ад капіталістычнай нечысці.

Але баі не скончаны. Аб гэтым напамінае шматлікая літаратура і фото аб вайне ў Іспаніі, у Кітаі. Імперыялістычныя драпежнікі зноў рыхтуюць сусветную бойню, мараць аб нападзе на адзіную несакрушальную апору міру — Совецкі Саюз.

Але магутны і моцны Совецкі Саюз. Як ніколі моцная гераічная Чырвоная Армія. Разам з ёй увесь совецкі народ гатовы даць сакрушальны адпор усім, хто асмеліцца ўзняць руку супроць бацькаўшчыны сусветнага пролетарыята. Сімвалізуючы гэтую сілу і магутнасць, узвышаецца на выстаўцы манументальны барэльеф чырвонаармейца з вінтоўкай і штыхом наперавес і ярка гараць на чырвоным фоне незабыўныя словы:

> «У совецкага народа
> ёсць што абараняць,
> ёсць каму абараняць,
> ёсць чым абараняць».

І. ВОЛГІН.

КАНЦЭРТЫ РАБОЧАЙ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

Рабочыя клубы і часці Менскага гарнізона абменьваюцца канцэртамі рабочай і чырвонаармейскай самадзейнасці, прысвечанымі 20-годдзю Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

У Доме Чырвонай Арміі адбыўся першы абменны канцэрт рабочай самадзейнасці для каманднага складу Менскага гарнізона і герояў грамадзянскай вайны, у якім прынялі ўдзел лепшыя сілы рабочых клубаў. Асабліва цёпла былі спатканы выступленні хора завода імя Варашылава, які выканаў рад песень Чырвонай Арміі і народаў СССР, работніцы калектыва будаўнікоў тав. Гальперынай, якая выканала беларускія народныя песні пад акампанімент цымбал, танцавальнага калектыва клуба работнікаў дзяржгандлю з яго нацыянальнымі танцамі, джаза Політэхнічнага інстытута і інш.

Асабліва спадабалася флоцкая пляска ў выкананні тт. Залуба і Мілановіч—членаў калектыва мастацкай самадзейнасці клуба работнікаў дзяржгандлю. Выдатным было і выступленне групы акрабатаў—рабочых шавецкай арцелі (Гомель) у складзе 10 чалавек.

Н-скі полк даў канцэрт у клубе імя Сталіна, прадэманстраваўшы перад партактывам і ўдзельнікамі самадзейнасці рабочых клубаў сваю мастацкую творчасць. Перад шматлікай аудыторыяй выступіў выдатны хор пад кіраўніцтвам Любана. Хор выканаў рад песень Чырвонай Арміі і народаў СССР.

С. Ф.

Гадавіна з дня смерці Г. К. Орджанікідзе

ВЯЛІКІ ПРОЛЕТАРСКІ РЭВОЛЮЦЫЯНЕР

18 лютага 1937 года няўмольная смерць абарвала прыгожае жыццё Серго Орджанікідзе. Перастала біцца сэрца чалавека незвычайнага душэўнага харастав, сапраўднага паэта соцыялістычнай працы.

Серго Орджанікідзе быў верным сынам свайго народа, крыштальна чэсным, непрымірымым да ворагаў і благароднейшым рыцарам рэвалюцыі. У Серго было вялікае і гарачае сэрца большэвіка. Чалавек выключнай большэвіцкай сілы і арганізатарскіх здольнасцей, камандарм цяжкой прамысловасці, ён згарэў на рабоце, аддаў сваё сэрца, усё сваё жыццё да апошняй кроплі крыві на карысць вялікай справы Леніна—Сталіна, на карысць народа.

Слаўны, незабыўны вобраз простага, вялікага большэвіка. Усё жыццё Орджанікідзе — гэта гераічныя старонкі гісторыі большэвіцкай партыі, соцыялістычнай рэвалюцыі, трыумфальнага шэсця краіны Советаў да комунізма.

З першых год сваёй рэволюцыйнай дзейнасці да апошняга ўздыху ён быў верны прынцыпам большэвізма, выдатнейшым вучнем геніяў чалавецтва, стратэгаў соцыялістычнай рэволюцыі—Леніна і Сталіна, другам і саратнікам таварыша Сталіна. Ворагі Леніна, ворагі Сталіна былі ворагамі Орджанікідзе.

Кароткія, але імклівыя 50 год жыцця Серго Орджанікідзе. 34 з іх цалкам належаць большэвіцкай партыі, барацьбе за соцыялізм.

Восем год Орджанікідзе быў у палоне царскага самаўладства, пакутваў у жандарскіх казематах, на катарзе, у ссылцы. У турмах ён загартаваўся як прафесіянальны рэволюцыянер.

У цяжкія годы падпольнай барацьбы з царскім самаўладствам ён выявіў сябе як выдатны арганізатар рабочага класа, як будаўнік большэвіцкай партыі. Вучачыся ў Леніна і Сталіна большэвізму, працуючы пад іх непасрэдным кіраўніцтвам, Орджанікідзе вёў бязлітасную барацьбу з апартуністамі, меншавікамі, з ворагамі рэволюцыі ўсіх масцей і колераў.

Калі выбухнулі громы Кастрычніцкай рэволюцыі, калі чатырнаццаць інтэрвенцыяніцкіх дзяржаў узнялі крывавы меч вайны над маладой рэспублікай, Серго Орджанікідзе становіцца на чале народных мас, ідзе штурмаваць крэпасці капіталізма, ачышчаць край ад нашэсця лютых зграй белагвардзейцаў і незлічоных банд замежных захопнікаў—інтэрвентаў.

Большэвіцкая партыя, Ленін і Сталін заўсёды накіроўвалі тав. Орджанікідзе на самыя адказныя ўчасткі барацьбы, туды, дзе было цяжка. У часы грамадзянскай вайны Серго стаў адным з выдатнейшых палкаводцаў, бясстрашным вадзіцелем, натхніцелем чырвоных палкоў супроць варожых армій. Надзвычайны камісар совецкага ўрада на Украіне і на поўдні Расіі, арганізатар совецкай улады на Доне, Кубані і Тэрэку, удзельнік абароны і ўмацавання пролетарскага Царыцына, актыўны саратнік і памочнік таварыша Сталіна ў разгроме белых банд пад Царыцынам — гэтай калыскай совецкай улады на паўднёвым усходзе Расіі. Ворагі добра памятаюць жалезныя сакрушальныя ўдары чырвоных войск, натхняемых Орджанікідзе. У дні грамадзянскай вайны Серго праявіў сябе, як адзін з выдатнейшых ваенных работнікаў партыі, як правадыр і арганізатар перамог на шмат якіх франтах. Орджанікідзе— — кіраўнік гераічнай абароны Уладзікаўказа, правадыр чачэнцаў і інгушоў, арганізатар разгрому Дзенікіна, Вічэрахава.



Г. К. ОРДЖАНІКІДЗЕ на Тушынскім аэрадроме (1936 г.).
Фота А. Гараніна.

Народы Беларусі ведаюць Орджанікідзе, як арганізатара вызвалення Беларусі ад белапольскага гнёту. Ленін і Сталін прыслалі Орджанікідзе ў якасці члена Рэволюцыйнага ваеннага совета ў XVI армію Заходняга фронта. Белапалякі ішлі на сталіцу Беларусі—Менск. Высветліць сапраўднае становішча на фронце было вельмі цяжка. З фронта паступалі супярэчлівыя весткі пра размяшчэнне ворага. І вось, у цёмную ноч Орджанікідзе разам з членамі Барысаўскага павятовага рэўкома і дзесяткам чырвонаармейцаў, з вінтоўкай у руках накіроўваецца ў першую разведку да Барысава. Разведчыкі заходзяць далёка ў тыл белапалякаў, дайшоўшы аж да прадмесця Барысава, высвятляюць колькасць сіл ворага, яго размяшчэнне. Праз два дні Барысаў быў узяты часцямі Чырвонай Арміі.

На чале XIV арміі ён разбіў Дзенікіна, выконваючы геніяльны план таварыша Сталіна па разгрому контррэволюцыі на поўдні. На Каўказскім фронце Серго вызваляе Паўночны Каўказ ад белагвардзейскіх ордаў. Затым бясстрашны палкаводзец Серго вызваляе Азербайджан ад улады мусаватістаў і стварае совецкую рэспубліку Закаўказзя. Працуючы пасля на Каўказе, ён граміць нацыяналістаў, меншавікоў і ўсіх ворагаў рэволюцыі, змагаецца за росквіт совецкіх закаўказскіх рэспублік.

У годы наспынных атак на партыю Леніна—Сталіна злейшых ворагаў соцыялізма — трацкістаў, зіноўеўцаў і іншых наймітаў фашызма, Серго Орджанікідзе кіраваў Цэнтральнай Кантрольнай Камісіяй. Верны сын партыі, ён ніколі не меў літасці да ворагаў. Серго не ўмеў прымірацца са злом, не ўмеў напалову любіць ці ненавідзець. Ен альбо любіў альбо ненавідзеў. У яго не было другога жыцця акрамя барацьбы за вялікую справу партыі Леніна—Сталіна. Усю сваю страсць большэвіка і сваю магутную сілу Орджанікідзе аддаваў жыццю і барацьбе. Змагацца і жыць, быць на перадавой лініі агню! — такім быў Орджанікідзе.

Жалезнай рукою ачышчаючы партыю ад ворагаў, жулікаў і прахадзімцаў, Орджанікідзе наносіў сакрушальныя ўдары па класаваму ворагу. Працуючы кіраўніком Цэнтральнай Кантрольнай Камісіі, верны вучань Леніна, вучань і саратнік Сталіна Серго праявіў арлінную зоркасць, ільвіную мужнасць, прамату і вернасць прынцыпам большэвізма. Ен бясстрашна выкарчоўваў змяіныя гнёзды контррэволюцыі, выкрываў здраднікаў, тройчы праклятых фашысцкіх наймітаў — трацкістаў і бухарынцаў і іншую погань з фашысцкага лагера. Таму так ненавідзелі ворагі жалезнага большэвіка, крыштальна светлага, адданага да апошняй кроплі крыві справе соцыялізма вялікага пролетарскага рэволюцыянера, любімца народа — Серго Орджанікідзе.

Апошнія годы Серго Орджанікідзе кіраваў цяжкой прамысловасцю, самай галоўнай артэрыяй краіны соцыялізма. Нездарма ён быў празваны камандармам цяжкой прамысловасці. Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна Орджанікідзе за годы пяцігодак прывёў соцыялістычную індустрыю да нябачанага трыумфа. Тут ён у поўнай меры разгарнуў свае выключныя якасці, свой талент арганізатара, кіраўніка.

Ведучы цяжкую індустрыю ад перамогі да перамогі, Орджанікідзе пераўзброіў сельскую гаспадарку, транспарт, армію і флот. Серго выхаваў цэлую армію герояў працы — рабочых, інжынераў, ён любоўна пеставаў магутны стаханаўскі рух — першага прадвесніка комуністычнай працы. Ен любіў народ, рабочы клас вялікай любоўю большэвіка. Серго быў уважлівым, клапатлівым і чулым. Ен увахадзіў ва ўсе дробязі, цікавіўся жыццём кожнага рабочага, інжынера, ён іх ведаў. Па памяці Серго мог назваць дзесяткі імён стаханаўцаў, дырэктароў заводаў, інжынераў, майстроў. Ен умеў вылучаць кадры, знаходзіць таленты, расціць іх, выхоўваць. Гэтаму ён вучыўся ў вялікага правадыра, у свайго друга, у таварыша Сталіна. І ён выхаваў сотні выдатных дзеячоў соцыялістычнай індустрыі, зрабіў нашу краіну магутнай індустрыяльнай дзяржавай, узброіў нашу родную Чырвоную Армію магутнай перадавой тэхнікай, дамогся высокага росту матэрыяльнага дабрабыту працоўных.

Год назад на баявым пасту памёр вялікі пролетарскі рэволюцыянер, паслядоўны большэвік, вучань Леніна, вучань і саратнік вялікага Сталіна.

Усе народы Совецкага Саюза ў гэту жалобную гадавіну смуткуюць аб заўчаснай смерці маршала сталінскіх пяцігодак. Соцыялістычная радзіма нізка схіляе свае баявыя сцягі.

Імя Серго, вобраз Серго, светлы і чысты, вобраз бясстрашнага народнага героя, любімца народа, будзе жыць вечна ў сэрцах працоўных. Ен быў узорам большэвіка, які змагаўся нястомна за наша шчаслівае жыццё. У пабудаваным у баях соцыялізме—багата энергіі, страсці Орджанікідзе. Справы Серго ніколі не памруць. Сцяг комунізма, за які змагаўся і аддаў усё сваё жыццё Серго Орджанікідзе, у надзейных руках. Яго высока трымае і нясе наперад да поўнай перамогі комунізма ва ўсім свеце вялікая партыя Леніна Сталіна.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

ЗА БОЛЬШЭВІЦКІ СТЫЛЬ У РАБОЦЕ

Партарганізацыя Кансерваторыі БССР праводзіць работу на вельмі адказным участку — на ўчастку падрыхтоўкі совецкіх спецыялістаў у галіне музыкі. Да Кастрычніцкай рэволюцыі на Беларусі не было ніякіх музычных устаноў. БССР зараз мае Кансерваторыю, чатыры музычныя вучылішчы і рад музычных школ.

Наяўнасць у Беларусі Дзяржаўнай кансерваторыі з'яўляецца вялікім дасягненнем у справе развіцця музычнай адукацыі народаў БССР. Гэта рэзультат правільнай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, ажыццяўляемай комуністычнай партыяй на чале з таварышам Сталіным У 1937 годзе Кансерваторыя дала рэспубліцы 22-х маладых музыкантаў з вышэйшай адукацыяй. Дасягненні ў галіне падрыхтоўкі музычных кадраў былі-б куды большымі, калі-б на чале кіраўніцтва Кансерваторыі не сядзелі ворагі народа, якія знарок развальвалі работу на гэтым вельмі важным участку культуры і якіх падтрымлівалі такія-ж ворагі народа з Упраўлення па справах мастацтваў.

Партарганізацыя Кансерваторыі з тав. Івановым на чале, хварэючы палітычнай бестурботнасцю, не змагла разглядзець сапраўднага твару ворагаў народа, не здолела сарваць з іх маску, хоць сігналы членаў партыі былі. Партыйнае кіраўніцтва Кансерваторыі было адарвана ад калектыва студэнтаў і педагогаў, не здолела ўзняць большэвіцкую пільнасць, крытыка і самакрытыка была занядбана. Комсамольская і профсаюзная арганізацыі ігнараваліся, не гледзячы на тое, што яны складаюць здаровы і здольны калектыў.

Тое, што ворагі народа, якія арудвалі ў Кансерваторыі, выкрыты не партарганізацыяй, а органамі пролетарскай дыктатуры, гаворыць аб тым, што партыйныя і непартыйныя большэвікі Кансерваторыі недастаткова ўсвядомілі ўказанні таварыша Сталіна, што мы знаходзімся ў капіталістычным акружэнні, што новыя ўмовы класавай барацьбы прымушаюць ворага маскіравацца, падрабляцца пад совецкага грамадзяніна, каб ўвайсці ў давер'е совецкіх грамадзян, і рабіць сваю агідную контррэволюцыйную справу.

Прайшло некалькі месяцаў пасля выбараў новага парткіраўніцтва Кансерваторыі, але належных зрухаў у рабоце партарганізацыі няма і зараз, не гледзячы на тое, што ўсе падставы для разгортвання работы ёсць. Партарганізацыя ўзброена такімі гістарычнымі рашэннямі, якія мабілізуюць усю нашу партыю на павышэнне рэволюцыйнай пільнасці, на выкарчоўванне германа-япона-польскіх шкоднікаў і дыверсантаў.

Некаторыя дасягненні ў рабоце партарганізацыі ўсё-ж ёсць. Палепшана комсамольская і профсаюзная работа, ёсць некаторы зрух у разгортванні крытыкі і самакрытыкі. Калі раней кіраўніцтва партарганізацыі было адарвана ад калектыва Кансерваторыі, дык зараз яно адчуваецца.

Калектыў Кансерваторыі актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет СССР не толькі ў сваёй установе, але і на выбарчых участках. Партарганізацыя ўдзельнічала ў падборы спецыялістаў-педагогаў і ва ўкамплектаванні Кансерваторыі студэнтамі на 1937—38 год, у выніку план набору кадраў выканан.

У далейшай сваёй рабоце партарганізацыі неабходна кіравацца партыйнымі рашэннямі аб разгортванні крытыкі і самакрытыкі, якая асабліва патрэбна і важна ў цяперашніх умовах, бо яна аблягчае справу барацьбы з ворагамі рабочага класа, дапамагае зрываць маскі фальшывай пільнасці з крыкуноў і кар'ерыстаў.

Большэвіцкая самакрытыка вымагае чулай увагі да сігналаў, якія ідуць знізу — ад радавых комуністаў, ад працоўных мас, ад калектыва. Рашэнні сакавіцкага і студзеньскага пленумаў ЦК ВКП(б) з'яўляюцца ўзорам большэвіцкай самакрытыкі, іх трэба выконваць.

Калектыў комсамольскай арганізацыі Кансерваторыі складаецца з 50 чалавек і пры належнай дапамозе яму ў рабоце з боку партарганізацыі, чаго да гэтага часу не было, ён зможа актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці і адыграе станоўчую ролю не толькі ў падрыхтоўцы маладых кадраў, але і ў выхаванні лепшых спецыялістаў музыкі.

Профарганізацыі ў навуковых установах маюць вялікае значэнне. Яны дапамагаюць у разгортванні крытыкі і самакрытыкі і ў вывучэнні людзей. Партарганізацыі Кансерваторыі неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на выхаванне членаў профсаюза ў духу комунізма, чаго да гэтага часу не адчувалася.

Вельмі важнаму ўчастку музычнага мастацтва зусім слаба дапамагала і дапамагае Упраўленне па справах мастацтваў. Да гэтага часу не ліквідаван разрыў у падрыхтоўцы кадраў паміж сярэднімі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Кансерваторыя недастаткова забяспечана адпаведнымі музычна-педагагічнымі кадрамі. Спецыялісты-педагогі, скончыўшыя ленінградскія і маскоўскія вышэйшыя музычныя навучальныя ўстановы, працуюць у Кансерваторыі, але да гэтага часу ім не забяспечаны добрыя кватэрныя ўмовы, аб чым асабліва павінна паклапаціцца Упраўленне па справах мастацтваў.

Зусім адсутнічала дапамога ў рабоце партарганізацыі Кансерваторыі з боку Сталінскага райкома КП(б)Б. Сталінскаму райкому неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на гэты ўчастак працы, абмеркаваўшы пытанне аб аслабаненні парторга Кансерваторыі ад іншай работы.

У сваёй штодзённай рабоце партарганізацыя павінна ўсямерна павышаць большэвіцкую пільнасць, бязлітасна выкрываць і выкарчоўваць да канца ўсіх вольных і нявольных ворагаў партыі. Лозунг аўладання большэвізмам, ажыццяўляемы зараз партыяй, патрабуе сур'ёзнейшага павароту ўвагі кіраўніцтва партарганізацыі і членаў партыі Кансерваторыі ў бок важнейшых пытанняў як міжнароднага, так і ўнутранага характару.

А. ВАРАШЫЛАЎ.

Пятрусь Броўка

ВЕРШЫ Я. КУПАЛЫ

Чытаеш кніжку вершаў Янкі Купалы «Беларусь ордэнаносная» і яшчэ раз бачыш на багатых, мастацка-яскравых вобразах, наколькі глыбока народны паэт ведае жыццё, як кроўна ён звязаны сваімі песнямі з народнымі масамі. Амаль кожная падзея ў жыцці нашай радзімы знаходзіць жывы водгук у натхнёных словах паэта, яго цікавяць быт калгасніка, лёс совецкай жанчыны, шчаслівае дзяцінства, жыццё і вучоба Чырвонай Арміі.

І трэба сказаць, што кніга «Беларусь ордэнаносная» — перш за ўсё кніга совецкага патрыятызма, якая складаецца з мужных, лірычных песень бязмежнай любві да сваёй радзімы і яе шчаслівага народа, да магутнай партыі і правадыра ўсяго працоўнага чалавецтва мудрага Сталіна.

У першым вершы, змешчаным у кніве, Янка Купала, як-бы аглядаючы пройдзены шлях радзімы і разам з ім свой, гаворыць, звяртаючыся да вялікага правадыра:

Табе, правадыр, мае песні і думы
І шчырыя шчырага сэрца парывы,
Бо хто калі сніў, ды і хто калі думаў,
Што буду я вольны, што буду
шчаслівы.
Бо хто калі думаў, што я жыці буду,
Як птушка, як вецер над нівай
квяцістай,
І дзівам дзівіцца вялікаму цуду,
Што вокал мяне так цуднее ўрачыста.

Што ты, правадыр, нібы яснае сонца
Мне вочы адкрыеш на землі і неба...
Свяціся-ж ты, сонца, ў маё век
аконца!
Вітаю цябе я і соллю і хлебам!

Вобраз мудрага Сталіна паўстае ў шматлікіх вершах Купалы. Падаючы мастацкімі фарбамі нашу рэчаіснасць, ён часта ў гарачых словах звяртаецца да таго, хто даў жыццё ўсяму совецкаму народу, хто любоўна ўзняў беларускі народ з цемры і галечы і прывёў яго да шчаслівых і радасных дзён.

Так, у вершы «Беларусі ордэнаноснай», звяртаючыся да краіны, Купала гаворыць:

У вадзіцы у крынічнай
Чысценька памыйся,
Прыбярыся ў кветкі-краскі,
Сонцам атуліся.
За ўсё тое, што стварылі
Шчыра твае людзі,
Ордэн Леніна сягоння
Твае ўквеціць грудзі.
Рана, позна — гэта ведай,
Ці сонца, ці зоры, —
Мудры Сталін падзяляе
Тваё шчасце й гора.

У вершы «З'езду Советаў» Купала, апісваючы становішча радзімы, зноў вяртаецца да вобраза правадыра:

Песню пранеслі
Сваю песняры
Вам, зямлі вольнай
Гаспадары.
Партыя-ж наша
І мудры наш Сталін
Да перамог
Шляхі паказалі.

Звароты да любімага правадыра мы бачым і ў вершах «Хлопчык і лётчык», «Нашаму святу», «Комсамолу» і інш.

Калгаснае жыццё Янка Купала ў сваіх вершах апявае, глыбока пранікаючы ва ўсе з'явы калгаснага жыцця, у сям'ю, у быт калгасніка. Змест яго твораў, прастата пабудовы, меладыйнасць прывялі да таго, што многія з іх спяваюцца народам, успрымаюцца народам, як сваё роднае, і зусім натуральна, што яны, пабыўшы ў народзе, даходзяць да нас праз фальклор. А адна з іх, «Алеся», пасля надрукавання ў «Праўдзе» стала песняй украінскага народа, толькі імя гераіні змянілася на Ганусю.

Характэрная рыса купалаўскіх калгасных вершаў, што яны ўсе амаль сюжэтныя і таму яшчэ больш успрымаюцца народам.

Возьмем такі верш як «Лён». Герой яго — маладая калгасніца. Будуецца ён проста, але падзеі ў ім даюцца ўвесь час нарастаючы. Дзяўчынка вясною пасеяла лён, як лён падрос — даглядала яго, палола і ў гэты час спадабала брыгадзіра Міхася. Лён вырас, адцвіў. Дзяўчына бярэ яго, брыгадзір, прыбіраючы копы, не кідае сваіх заляцанняў. А пасцілала лён — ад душы ўжо цалавала брыгадзіра, а ў час, калі ўжо мяла лён, брыгадзір быў яе мужам і стаўляў для яе новую хату.

Тут вельмі ўдала спалучаюцца дзве лініі развіцця сюжэта, адна — лінія працэсу працы, другая — лінія асабістая, лінія кахання, прычым адна дапаўняе другую, ствараючы поўнакроўны малюнак калгаснага быту. Гэты верш як-бы разлічаны на песню: цёплыя, лірычныя радкі яго заключаюцца ўдалым рафрэнам-прыпевам.

Як на поле, на зямлю
Прышла раніца вясны,
Я пасеяла ў раллю
Жмені зёран ільняных.
Неба сеяла цяпло,
Цёплы дождж(ы)к церушыў,
У думках радасна было,
Беглі песні ад душы.
Ой, лянок, лянок мой чысты,
Валакністы, залацісты!

Добра падае Янка Купала адпачынак калгаснікаў у сваім вершы «Вечарынка». Праўда, гэта адзін бок адпачынку, але пададзены ён праўдзіва і пераканальна. Калі чытаеш верш, перад вамі паўстае малюнак адпачынку нашых калгаснікаў. Пра тое, што вечарынка адбываецца ў калгасе, там сказана ўсяго некалькі слоў, але з падачы вобразаў чытач бачыць, што гэта іменна калгасная вечарынка:

Прышлі з поля, з гаспадаркі,
Клуб напоўніўшы да краю,
Брыгадзіры і даяркі,
Брыгадзіркі і свінаркі,
А гармонік грае, грае.

За сталом ідзе бяседа
Аб жыцці, аб ураджаі,
П'е суседка за суседа,
Хто не снедаў, тут даснедаў,
А гармонік грае, грае.

Зноў-жа, гэты верш па ўдалай музыцы, напісанай кампазітарам Ямпольскім, спяваецца народам. Калгасная заможнасць сакавіта паказана паэтам у вершы «Госці»:

А з падарункамі прышлі ў госці
Зямлі абноўленай гаспадары:
Пірог пшанічны, кветкі, лёну горсці
На стол паклалі й мёду пляйстары.
І селі мы з павагай дзіўнай нейкай
За стол, дзе быў пірог, і лён, і мёд...
За хатай заліваўся салавейка.
Гудзеў над хатай гулкі самалёт.

Чытаючы гэтыя радкі, не толькі бачыш вонкавы выгляд калгаснай бяседы, але адчуваеш душэўны настрой удзельнікаў гэтай бяседы.

Беручы жывыя, канкрэтныя факты з жыцця калгасаў, Янка Купала стварыў багата песень, якія добра паказваюць наша калгаснае жыццё. Я падаў кароткі агляд толькі некаторых калгасных вершаў, у кніжцы яшчэ шмат добрых твораў, як «Алеся», у якім паказваецца, як вырасла з беднай дзяўчыны-сялянкі мужная дзяўчына-пілот.

Адным з галоўных матываў у кніжцы вершаў «Беларусь ордэнаносная» з'яўляецца тэма Чырвонай Арміі. Прычым магутнасць нашай арміі паказваецца Янкам Купалам не голымі сцвярджэннямі пра яе дужасць, а канкрэтным паказам людзей, чырвонаармейцаў і яе палкаводцаў — самай галоўнай сілы, з якой складаецца наша непераможная Чырвоная Армія. Мне хочацца спыніцца на адным, самым лепшым, на маю думку, вершы, з гэтага чырвонаармейскага цыкла, на вершы «Як у госці сын прыехаў». Зноўжа пабудова яго простая, але строга сюжэтная. Да маці прыехаў у госці сын-чырвонаармеец, маці запрашае яго ў святліцу, садзіць за стол, частуе і распытвае пра службу. Углядаюцца праз вокна суседкі на прыгожага, стройнага хлапца. Сын падрабязна расказвае маці пра сваё жыццё ў Чырвонай Арміі, і з яго апавядання паўстае перад чытачом сапраўдная сіла Чырвонай Арміі:

Байцы-ж нашыя — героі.
Ты не знойдзеш гэткіх армій.
Што за выпраўка у строі,
Што за послух у казарме!

З вялікай цеплынёй і любоўю Купала, праз словы свайго героя, малюе вобраз палкаводца Чырвонай Арміі, жалезнага наркома абароны Клімента Ефрэмавіча Варашылава. Я прывяду некалькі строф з гэтай мясціны.

Адным словам, свой брат родны,
Адно хочаш, мая маці,
Быць яго дастойным, годным,
За яго жыццё аддаці.

Конь пад ім, прост, вярнігора!
А як скача, як гарцуе!
Ен вачыма лічыць зоры,
Ен вушамі вайну чуе.

Вайну чуе, броў не хмура,
Толькі бліскаюць падкоўкі,
Бо яздок на ім што бура,
З віхрам пойдзе ў перагонкі.
У міжбур'е з ім жыць міла,
Лёгка-ж будзе і ў паходзе.
Во, які наш Варашылаў!
Во, які наш палкаводзец!

Вельмі мілагучны і змястоўны верш «Выпраўляла маці сына». Купала моцна верыць у вялікую сілу нашай Чырвонай Арміі, якая разаб'е ўсялякіх ворагаў:

Пад чырвонай зоркаю
Армія Чырвоная
Пройдзе долы, горы
І лясы зялёныя.
(«Пад чырвонай зоркаю»).

Страснымі, поўнымі нянавісці словамі б'е Купала па ворагах, па ўсялякіх здрадніках радзімы.

У вершы, напісаным на смерць аднаго з кіраўнікоў партыі, любімага Сяргея Міронавіча Кірава, забітага трацкісцка-зіноўеўскімі бандытамі, Купала выказвае сваю нянавісць да іх:

Гнеў пролетарскі мог і зможа змесці
З зямлі ўсіх падкалодных яшчарыц,
гадзюк,
І ворагам за смерць адплацім
грознай смерцю,
Вышэй падымем сцяг, што выпаў з
слаўных рук.

Купала сваім вострым мастацкім словам навек клейміць прадажных разбойнікаў, бандытаў гітлераўскай службы. Купала, пішучы аб працэсе над бандай трацкістаў, дыверсантаў, правільна перадае настрой нашай радзімы:

Мала іх павесіць
На сухой асіне,
Бо нават асіна
Ад сябе адкіне.
Дзерава адкіне,
Дзерава сухое,
Сябе не спаганіць
Поскуддзю такою.

У вершы «Партызаны», апісваючы здраду аднаго партызана, паэт стварае такі малюнак, што калі чытаеш верш, узнікае вялікая агіда да здрайцы:

...Як-жа свой партызан адзін здрадзіў
І навёў ліхадзеяў к засадзе, —
Пайшоў гул па зялёных імшарах,
Паплылі небам чорныя хмары.
...А на вогнішчы попелу горсці,
А ў тым попеле чорныя косці..
Выюць ночкай ваўкі на палянцы,
Касцякі даядаючы здрайцы.

Я зноў гавару, што Купалава паэзія ўзнімае амаль усе хвалюючыя тэмы нашага жыцця. Я спыніўся толькі на частцы вершаў са зборніка «Беларусь ордэнаносная». Чытачу добра вядомы такія вершы, як «Сыны», «Хлопчык і лётчык» і іншыя. Па іх чытач бачыць, што паэзія Купалы расце ад карэнняў беларускага народа. Дарма некаторыя крытыкі-раппаўцы даводзілі, што ў Купалы застой, што ён не ведае совецкай рэчаіснасці. Жыццё давяло адваротнае — кожны купалаўскі верш паражыў такога крытыка. Кніжка «Беларусь ордэнаносная» з вялікай пераканальнасцю паказвае, што народны паэт Янка Купала — у росквіце сваіх творчых сіл, што ён добра зразумеў совецкую рэчаіснасць, што ён родны ёй.

Маладая паэзія павінна вучыцца ў Купалы майстэрству пабудовы верша, прастаце, совецкаму патрыятызму

У адным з сваіх выказванняў Янка Купала пісаў: «Некалькі часу таму назад я даведаўся, што заходне-беларускія нацыянал-фашысты называюць мяне большэвіком. Тут яны не памыліліся. Так, я сам лічу сябе беспартыйным большэвіком і гэтым ганаруся. Я з радасцю буду выконваць усе тыя задачы, якія паставіць перада мной партыя большэвікоў.

Я аддам усю сваю творчасць, а калі трэба будзе — і жыццё за вялікую справу нашай совецкай бацькаўшчыны, за справу Леніна — Сталіна».

Гэтыя словы — лепшая прадмова да ягонай кніжкі «Беларусь ордэнаносная».

АЛЯКСАНДР СЯРГЕЕВІЧ ДАРГАМЫЖСКІ

(ДА 125-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)

Аляксандр Сяргеевіч Даргамыжскі (1813—1869), адзін з найвялікшых рускіх кампазітараў мінулага стагоддзя, займае ў гісторыі рускай музыкі асобнае і своеасаблівае месца. Заслуга Даргамыжскага састаіць у тым, што ён быў першым рускім кампазітарам, які свядома паставіў сваёй асноўнай задачай барацьбу за жыццёвую праўду ў галіне рускага нацыянальнага музычнага мастацтва.

Адпраўным пунктам творчасці Даргамыжскага быў вялікі Глінка — заснавальнік рускай нацыянальнай школы музыкі. Будучы непасрэдна знаёмым з Глінкам, Даргамыжскі знаходзіўся пад яго моцным уплывам, разам з ім засвоіў усё лепшае з заходне-еўрапейскай музыкі і пазнаёміўся праз свайго вялікага друга з сучаснай яму еўрапейскай кампазітарскай тэхнікай.

Даргамыжскі не дасягнуў дасканаласці глінкінскіх музычных форм, не ўладаў багаццем меладычнага даравання Глінкі, але затое ён шырэй ахапіў у музычнай творчасці соцыяльную рэчаіснасць свайго часу.

Рэалістычныя карціны народнага жыцця, з яго радасцямі і смуткам, вострыя музычныя сатыры, малюючыя свет бязмежнага чыноўніцкага падхалімства, глыбокія псіхалагічныя перажыванні — такі рознастайны змест творчасці Даргамыжскага. Прыкланяючыся перад мастацкімі вартасцямі музыкі Глінкі, Даргамыжскі ў сваіх выказваннях адзначаў недастатковасць, на яго думку, драматычных элементаў у гэтай музыцы.

«Майстэрскі, арыгінальны твор, — пісаў ён аб «Іване Сусаніне» Глінкі, — столькі характва, што промахаў не хочацца і заўважаць. Адно ў гэтай оперы не задавальняе: мала драматычнай праўды». Барацьбу за «драматычную праўду», за праўдзівую, жыццёвую перадачу ў музыцы рознастайнейшых чалавечых перажыванняў Даргамыжскі лічыў сваёй асноўнай творчай задачай. Гэтыя, зусім новыя для свайго часу, ідэалы кампазітар упарта і паслядоўна ўвасабляў у сваёй творчасці.


***

А. С. Даргамыжскі паходзіў з сярэдне-дваранскай памешчыцкай сям'і. Ужо ў раннім маленстве выявіўшы вялікія музыкальныя здольнасці, ён атрымлівае хатнюю, далёка недастатковую, адукацыю — вучыцца іграць на фортэп'яна, скрыпцы, а потым—спевам. Неўзабаве юны Даргамыжскі набывае вядомасць у пецербургскіх салонах, як «бойкі фортэп'яніст» (выраз Глінкі), а таксама як аўтар рамансаў і дробных п'ес для фортэп'яна.

Выдатны розум, развітае пачуццё гумару, уменне заўважаць у жыцці характэрнае — як камічнае, так і драматычнае, прыводзяць Даргамыжскага да спроб стварэння жывых музычных характарыстык. Гэткі, напрыклад, «Жарт» для фортэп'яна, «Палкасць і халоднакроўе» — п'еса, якая мае падзагаловак «пісана з натуры».

Чыноўніцкая кар'ера, якая была пачата Даргамыжскім, не вабіла яго. Хутка ён кідае лямку чыноўніцкай службы ў чыне тытулярнага саветніка і цалкам аддаецца музычнай творчасці. Вакальная галіна найбольш прыцягвае кампазітара. І Даргамыжскі ў гэтай галіне паўней за ўсё ўжывае свой прынцып драматычнай праўды ў мастацтве.

Кампазітарскі шлях Даргамыжскага не быў увечаны лаўрамі. У 1839 годзе Даргамыжскі закончыў сваю першую оперу «Эсмеральда» (па сюжэту рамана В. Гюго «Сабор парыжскай багамацеры») і прадставіў яе ў дырэкцыю казённых тэатраў. Опера была напісана паводле французскіх узораў і з'яўлялася мала арыгінальнай. «Але ў драматычных сцэнах ужо праглядвае тая мова праўды, якую, нарэшце, імкнуўся я развіць у рускай сваёй музыцы» — пісаў Даргамыжскі пазней.



З пастаноўкай гэтай оперы кампазітара пасцігнула першая буйная няўдача. Тупы чыноўнік, дырэктар імператарскіх тэатраў Гедэонаў літаральна здзекваўся з кампазітара. Спачатку ён доўга не даваў кампазітару адказу, потым абвясціў оперу прынятай, але яна, з-за бясконцых адцяжак, чакала пастаноўкі аж каля 8-мі год. Упершыню «Эсмеральда» была пастаўлена ў Маскве ў 1847 годзе і мела нядоўгі поспех. Некаторыя «знаўцы» абвясцілі першае опернае дзецішча Даргамыжскага занадта «сур'ёзным» для тагочаснай свецкай публікі. Зразумела пагэтаму, што калі кампазітар прадставіў на разгляд тэатральнай дырэкцыі сваю новую оперу «Урачыстасць Вакха» (на тэкст юнацкай оды Пушкіна), яна была забракавана.

Наперакор бяздушным адносінам афіцыйных тэатральных сфер, музыкальная публіка ўжо ведала і высока цаніла Даргамыжскага, галоўным чынам, за яго рамансы.

У 1856 годзе Даргамыжскі закончыў п'есу «Русалка». Убогая, скалечаная скарачэннямі, пастаноўка гэтай оперы, па музыцы непараўнальна больш смелай і самабытнай, чым папярэднія, — поспеху амаль не мела. Не гледзячы на гэты новы ўдар, Даргамыжскі прадаўжае напружаную творчую работу: стварае рад насычаных гумарам аркестровых п'ес — «Чухонскую фантазію», «Бабу-Ягу», «Казачок», піша свае лепшыя, яркія па драматызму рамансы — «Стары капрал», «Чарвяк», «Тытулярны советнік», «Рассталіся горда мы» і г. д. Гэтыя рамансы — надзвычай вострая музычная сатыра, новы жанр у гісторыі рускай песеннай творчасці, які з поспехам прадоўжваўся Мусаргскім.

Незадоўга да смерці кампазітар узяўся за свой апошні твор — оперу «Каменны госць» (па Пушкіну). Імкнучыся як можна праўдзівей перадаць у гуку словы паэта, Даргамыжскі ўвасобіў пушкінскі тэкст у суцэльных выразных рэчытатывах, адмовіўшыся амаль ад усіх прынятых оперных штампаў. Гэты вопыт трэба прызнаць цікавым і плённым для далейшых этапаў развіцця рускай оперы.

Але адсутнасць арый, ансамбляў, інструментальных нумароў вельмі аслабляла оперу, і «Каменны госць» да нашых дзён не знаходзіць сабе сталага месца ў тэатральным рэпертуары, не гледзячы на наяўнасць асобных бліскучых эпізодаў. Кампазітар не закончыў гэту оперу. Цяжкая сардэчная хвароба, а потым смерць у 1869 годзе спынілі яго работу.

У 1872 годзе опера «Каменны госць» была пастаўлена, але асаблівага поспеху не мела.

У апошнія годы жыцця Даргамыжскі шчыльна наблізіўся да перадавога музычнага гуртка новай рускай школы— «Магутнай кучкі» (Балакірэў, Кюі, Рымскі-Корсакаў).

***

У рускім музычным мастацтве няма кампазітара, які ў сваёй творчасці быўбы звязаны з Пушкіным шчыльней, чым Даргамыжскі. Важнейшыя якасці паэзіі Пушкіна — чалавечнасць, глыбокі рэалізм і рознастайнасць мастацкіх вобразаў прыцягвалі Даргамыжскага на працягу ўсіх год яго творчасці. Дастаткова сказаць, што з чатырох опер, напісаных кампазітарам, тры звязаны з імем Пушкіна — «Урачыстасць Вакха», «Русалка» і «Каменны госць». Даргамыжскі і ў сваёй камернай творчасці ўдзяліў Пушкіну адно з асноўных месц. Ён напісаў на тэксты Пушкіна каля двух дзесяткаў сольных рамансаў і да дзесяці ансамбляў (дуэтаў, трыо, хораў).

Значэнне Пушкіна ў творчасці Даргамыжскага зусім не абмяжоўваецца колькасным бокам. Паэзія Пушкіна, выразная і надзвычай глыбокая псіхалагічна, дапамагла кампазітару знайсці праўдзівую музыкальную дэкламацыю і распрацаваць новы тып выразна апраўданай мелодыі, г. зн. дапамагла яму вырашыць задачу стварэння драматычна праўдзівага, рэалістычнага рускага нацыянальнага музычнага мастацтва.

Росквіт драматычнай творчасці Даргамыжскага звязаны з операй «Русалка». Яркая соцыяльная калізія, надзвычайная выпукласць характарыстык Наташы, мельніка і інш, глыбіня, праўдзівасць іх псіхалагічнай трактоўкі, прастата і жыццёвасць драмы Наташы, нарэшце, выразная сіла мовы, лаканізм дыялагу — усе гэтыя якасці твора Пушкіна зрабілі яго ўдзячным грунтам для стварэння музычнай драмы. Аб «Русалцы» Пушкіна крытык Дабралюбаў гаварыў як аб творы, у якім з найбольшай яркасцю ўвасоблены рысы рускай народнасці, якімі Пушкін так умела валодаў. Імена гэтая форма рускай народнасці была са здзіўляючай правільнасцю схоплена Даргамыжскім. Але і самы змест трагедыі моцнай, благароднай жанчыны з народа, недарэчна загубленай жорсткімі традыцыямі пануючага класа, — перададзен кампазітарам з захапляючай драматычнай сілай і пераканаўчасцю.

«Русалка» — не толькі здабытак мінулага, яна — жывы музычна-драматычны твор, які заняў сталае месца ў рэпертуары нашых оперных тэатраў.

Ал. КАРПОВІЧ.

„БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫЯ“

(Прэм'ера Дзяржаўнага драматычнага тэатра БССР)

Улада грошай і людскія подласці — з аднаго боку, і пакуты — з другога, абумоўленыя гэтай уладай, — тэма большасці твораў А. Н. Астроўскага. Гэта не дзіўна, бо тэма гэтая лезла з кожнага шва сучаснага аўтару грамадскага ладу. Для нас творчасць А. Н. Астроўскага тым і каштоўна, што ў ёй аўтар праз рэалістычны паказ мінулага царскай Расіі гістарычна праўдзіва ўскрывае ўсю агіднасць тоўстасумых уладароў жыцця і ўсю бездапаможнасць пакрыўджанага і абыйдзенага жыццём люду. Гэтым пытанням прысвечана і камедыя «Без віны вінаватыя».

Бедная дзяўчына Отрадзіна мае ад свайго каханка, чыноўніка без сродкаў Мурава — сына, які патаемна ад людскіх вачэй і плётак выхоўваецца ў бабкі Галчыхі. І вось на Отрадзіну валяцца два ўдары: яна даведваецца, што Мураў яе, бедную нявесту, кідае і жэніцца на багатай; прыбягае Галчыха з паведамленнем, што сын яе памірае... Такі змест першай дзеі.

Далей з героямі п'есы мы сустракаемся праз 17 год.

Отрадзіна — вядомая артыстка Кручыніна. Мураў — удавец, буйны землеўласнік і багацей; сын Кручынінай Грыша — бязродны, актор Незнамаў.

Кручыніна смуткуе аб знікшым сыне, у смерць якога не верыць і шукае яго. Мураў баіцца кампраметацыі і стараецца альбо ажаніцца з ёй, альбо выправадзіць яе з горада. Незнамаў, даведзены ярлычком «падзаборніка» і вынікамі гэтага ярлычка да азвярэння, пакутуе, п'янствуе і дэбашырыць.

Дзякуючы раду акалічнасцяў, Кручыніна пазнае свайго сына. Незнамаў знаходзіць маці... Дабрадзійнасць урачыстуе.

Такі змест апошніх трох актаў.

Здавалася-б, перад тэатрам ляжала ўдзячная задача — паказаць соцыяльную падаплеку чалавечых пакут і затым ужо разгарнуць малюнак гэтых пакут без віны вінаватых.

Аднак, пастаноўшчык паказу — мастацкі кіраўнік Дзярждрамтэатра тав. Рахленка палічыў за лепшае адрэзаць ад п'есы яе соцыяльную канву — першую дзею, і даць паказ меладрамы аб згубленым і знойдзеным сыне.

Паказ такой меладрамы мы ніякім чынам не можам прызнаць шкодным; ён хвалюе гледача, абуджае ў ім лепшыя чалавечыя пачуцці, але такіх меладрам вельмі багата і для такой мэты зусім не трэба кастрыраваць класічны твор, які мы хочам бачыць на сцэне ва ўсёй паўнаце, з усёй яго гістарычнай праўдай і абгрунтаванасцю.

Проста дзіву даешся, як гэта падобныя шматлікія «эксперыменты» (шмат разоў ужо асуджаныя) не навучылі тэатр да гэтага часу пазбягаць іх ганебнага вопыту, які шкодна адбіваецца не толькі на каштоўнасці ўсяго паказу, як мастацка-суцэльнага, але і на трактоўцы паасобных вобразаў. Прыкладам чаго можа служыць Мураў у выкананні заслужанага артыста Дзядзюшкі.

Паводле трактоўкі тав. Дзядзюшкі — гэта тыповы меладраматычны злачынец, з насупленымі брывамі і хмурым позіркам, ледзь не дзетазабойца, — характар хоць і агідны, але моцны. Паводле-ж аўтара Мураў — гэта толькі тля, дрэнненькі чалавечак, які можа апукаць дзяўчыну, прадаць за грошы свае пачуцці, гонар і свабоду, зрабіцца за грошы лакеям сваёй жонкі, прысці, як пабіты сабака, да былой пакрыўджанай ім каханкі і выпрашваць прабачэння, можа нават, трасучыся за свой грамадскі стан, пагражаць ёй... Але не больш. Гэта не меладраматычны злачынец, а тыповы прадстаўнік мізэрных нягоднікаў — выхаванцаў капіталістычнага грамадства.



Арт. Ржэцкая ў ролі Кручынінай.
Зарысоўка Г. Дакальскай.

Заслужаны артыст Владамірскі ў ролі актора Шмагі, з вялікай шчодрасцю рассыпаючы фарбы сваёй ігры, з незвычайнай для яго лёгкасцю і пераканаўчасцю стварае вобраз падхаліма, фігляра і п'яніцы. Але гэтым і абмяжоўваецца. Усе чалавечыя рысы, якія ёсць у Шмагі, тав. Владамірскі пакідае без ўвагі. Вынікам такога павярхоўнага разумення ролі з'яўляецца тое, што па сцэне ходзіць клоун, які ў некаторых месцах зрывае ігру Кручынінай і Незнамава, што, безумоўна, псуе ансамбль.

Артыстка Ржэцкая ў ролі Кручынінай здолела перамагчы ўласцівую ёй акторскай індывідуальнасці рэзкасць і з вялікай глыбінёй, цеплынёй і мяккасцю перадае пачуцці маці. Нават у сцэнах з Муравым і Галчыхай тав. Ржэцкая не зрываецца на рэзкасць і эфектыўнасць. Шчыра і чула выконвае тав. Ржэцкая гэтую складаную ролю.

Вельмі добрым партнёрам ёй—артыст Платонаў, які абаяльна, тэмпераментна і шчыра выконвае ролю «падзаборніка» Незнамава. Гарэзліва-нахабны ў пачатку, ён бянтэжыцца, задумваецца, смуткуе, упадае ў роспач і праз усё гэта час-ад-часу выбухае звыклай нахабнасцю і адчаем; і пасля апошняга такога выбуху — бязмежная радасць. Увесь гэты рад пачуццяў тав. Платонаў здолеў звязаць досыць тонкімі нюансамі, пад усімі гэтымі пачуццямі здолеў захаваць асноўнае зерне ролі— ні за што пакрыўджанага, безвыходна-бяспраўнага і праз гэта азвярэлага чалавека.

Артыстка Лідская ў ролі правінцыяльнай прыма-гераіні Карынкінай не можа пахваліцца ні тонкасцю, ні шчырасцю выканання. Так, напрыклад, сцэну з Незнамавым у другім акце спектакля яна вядзе настолькі груба, што Незнамаў павінен быць абсалютным дурнем, каб папасціся на вудачку яе інтрыгі. А ў апошняй дзеі, калі тав. Лідскай трэба выявіць сапраўднае пачуццё — злосць Карынкінай на Незнамава, мы бачым не шчырасць, а грубы наігрыш. Такіх прыкладаў можна было-б прывесці шмат, але абмяжуемся гэтым.

Артыст Шапко задумаў нядрэнны вобраз правінцыяльнага героя-любоўніка — бесталаннага фата Мілаўзорава; але, на жаль, на палітры тав. Шапко знайшлася толькі адна фарба — скамянелае ў нерухомасці фатаўство, у якім Мілаўзораў і знаходзіцца на працягу двух актаў, і ніякія дробненькія пачуцці гэтага чалавечка, якімі так страката гэтая роля, не могуць выбіцца з-пад броні аднастайнага ад пачатку да канца тону.

Багаты барын Дудукін—чалавек досыць шчыры і чулы, які разумее мастацтва, цэніць яго і з нуды мецэнатчае (зразумела, не без карысці для сябе), тыповы барын — у выкананні артыста Іванова-Казельскага ператварыўся ў спрытнага падрадчыка, ці каміваяжэра — але ніяк не больш.

Удалы вобраз напоўвар'яткі — жабрачкі Галчыхі стварыла артыстка Вашкевіч.

Рэжысёрская работа ў спектаклі не вызначаецца ні вынаходлівасцю мізансцэніроўкі, ні дакладнасцю апрацоўкі дзеі. Напрыклад, натоўп гасцей у апошняй сцэне. Проста прыкра глядзець на гэтую «жывую мэблю» — статыстаў даўнейшай правінцыяльнай сцэны. Дзяржтэатру зусім не да твару такая «распрацоўка» масавых сцэн.

Афармленне мастака Шкляева не вызначаецца ні творчай выдумкай (велізарная, цяжкая ўстаноўка), ні рэалістычным разуменнем рэчаў (у першай дзеі на сценках павільёна нехапае толькі клапоў), ні ахайнасцю (брудна-зялёныя, пакамечаныя падугі, незразумелыя і непатрэбныя, працятыя белым слупом антрэсолі на доме Дудукіна ў трэцяй дзеі), — усё гэта мала спрыяе мастацкаму боку спектакля.

Нам даводзілася ўжо бачыць у Белдзяржрамтэатры пастаноўку п'есы А. Н. Астроўскага «Ваўкі і авечкі» (пастаноўка тав. Рахленка). І калі мы пачынаем параўноўваць спектакль «Ваўкі і авечкі» з «Без віны вінаватымі», дык параўнанне гэта прымушае нас сказаць, што апошняя прэм'ера тэатра — «Без віны вінаватыя» — нават не таптанне на месцы, а, за выключэннем работ тт. Ржэцкай і Платонава, крок назад, што з'яўляецца сігналам аб пэўнай небяспецы на шляху далейшага росту Дзяржаўнага драматычнага тэатра БССР.

М. ІЛЬІНСКІ.

АД РЭДАКЦЫІ

У артыкуле «Справы літфондаўскія» («ЛІМ» № 8 ад 10 лютага 1938 года), з прычыны таго, што ў акце камісіі Літфонда СССР няправільна названа прозвішча асобы, якой выдадзены грошы без распіскі, спамянута прозвішча тав. Александровіча, які, як высветлілася, не мае ніякага дачынення да гэтых грошай.

У гэтым-жа артыкуле сярод даўжнікоў павінны быць і прозвішчы—тт. Шарапава — 1.450 руб., Кучара—800 руб.

М. Ларчанка

ДА ПЫТАННЯ АБ ГІСТОРЫІ СТАРАЖЫТНЯЙ І ПАЧАТКУ НОВАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

(Працяг. Пачатак у газ. № 8 за 1938 г.).

IV.

Арыгінальнай і вельмі цікавай як па зместу, так і па форме ў пісьмовай беларускай літаратуры XVI стагоддзя з'яўляецца «Прамова Івана Мялешкі, кашталяна Смаленскага, сказаная на Варшаўскім сойме ў прысутнасці караля Сігізмунда III у 1589 годзе». Па свайму жанру «Прамова» Івана Мялешкі ёсць сатырычна-палітычны памфлет, дзе вельмі ярка, вобразна і жыва выражаны пратэст супроць польскіх паноў. У гэтым помніку старажытнай беларускай літаратуры саркастычна высмеяны польскія паны і шляхта, тыя князі і каралі, якія больш любілі немцаў і пагардліва адносіліся да рускіх і беларусаў. Аўтар «Прамовы» гаворыць аб тым, што ён, з'яўляючыся дэпутатам з Смаленска і Мазыра, сам належыць да тых людзей, якія «палітыкі не зналі, а праўдаю ў рот, як соллю, у вочы кідалі». Ён у сатырычнай і гумарыстычнай форме зазначае, што дрэнна жылося пры ўсіх каралях і князях, пры Сігізмундзе III таксама дрэнна жывецца людзям, бо яны «без нагавіц, як Бернадыны гулялі, а сарочкі аж да костак, а шапкі аж да самага пояса нашывалі». Далей аўтар выкрывае паноў: «Калі-ж да цябе панічок прыдзе, частуй-жа яго дастаткам, ды і жонку сваю ля яго пасадзі; а ён сядзіць, як бес, надуўшыся, махае шапкаю ці капелюшом. А вось у якой мастацкай форме высмейваецца шляхецтва: «А дваранін у ножку, як сокал, заглядае, каб дзе шчыпнуць салодкага мяса».

Іван Мялешка ў сваёй «Прамове» адкрыта выступае супроць Рэчы Паспалітай, супроць паланізацыі, якая ў той час праводзілася польскімі панамі. Ён гаворыць, што вельмі багата шкоды прынеслі паны-палякі простаму беларускаму народу. І таму ён рэзка на іх нападае, крытыкуе і высмейвае. Беларусь амаль да канца XVIII стагоддзя заставалася пад уладаю польскіх паноў, якія здзекваліся з звычаяў беларускага народа і яго мовы.

Старажытным помнікам гэтых здзекаў з'яўляюцца «Школьныя інтэрмедыі», альбо «драмы», якія пісаліся выкладчыкамі рыторыкі ў шматлікіх іезуіцкіх школах, узнікшых у польска-літоўскай дзяржаве. Гэтыя школьныя драмы звычайна пісаліся на польскай і лацінскай мовах; па свайму духу яны з'яўляліся польскімі. У гэтых творах усхваляліся польскія паны, шляхта і высмейвалася беларускае сялянства. У кожную з гэтых драм уводзіўся персанажны вобраз селяніна-беларуса, які гаворыць на беларускай мове. Ён малюецца імі больш нізкай у параўнанні з палякамі істотай. У гэтых школьных драмах узводзіўся нахабны паклёп на беларускі народ, які польскія паны імкнуліся паказаць, як духоўна неразвіты і нездольны. Аднак, ім гэта не заўсёды ўдавалася. У асобных інтэрмедыях беларускі селянін, гаворачы на сваёй мове, у форме народных прымовак едка і дасціпна высмейвае польскіх паноў. Гэты момант нават у «Школьных драмах» паказвае, што беларускі народ, знаходзячыся пад страшэнным прыгнётам Польшчы, вёў барацьбу з польскімі захватчыкамі за сваю незалежнасць і самастойнасць.

V.

Калі ў сярэдзіне XVIII стагоддзя пачалося далучэнне беларускіх абласцей да Расіі, у сувязі з вядомым раздзелам Польшчы, у развіцці беларускай літаратуры вызначаецца некаторы новы паварот. Далучэнне Беларусі, як і Украіны, да Расіі стварала больш спрыяльныя ўмовы для развіцця беларускай мовы і вуснай народнай творчасці, таму што гэтае далучэнне з'ўлялася меншым злом у параўнанні з тым становішчам, якое Беларусь займала пад уладаю Польшчы. Вядома, не салодка жылося беларускаму працоўнаму народу і пад уладай царскай Расіі; яго прыгняталі царскія каланізатары і жорстка эксплаатавалі «свае» крывасмокі-памешчыкі і кулакі. Але беларуская культура, праз галаву царскіх рэакцыянераў, знаходзіла шляхі да культуры рускага і ўкраінскага народа. Гэтае блізкае дачыненне і яднанне трох вялікіх славянскіх народаў дало пэўны штуршок развіццю беларускай народнай мовы і літаратуры.

У канцы XVIII і ў пачатку XIX стагоддзя ўзнікае новая беларуская мастацкая літаратура на жывой народнай мове. Трэба адзначыць, што ў гэтай літаратуры, як і ў старажытнай, нам далёка яшчэ не ўсё вядома. Трэба заняцца сур'ёзным разглядам архіўных матэрыялаў, сярод якіх можна знайсці нямала новых твораў беларускай літаратуры.

З таго, што нам вядома, вельмі цікавымі помнікамі новай беларускай літаратуры з'яўляюцца народныя гістарычныя і міфалагічныя песні «Быў на Русі чорны бог», «У лесе цёмным», «У Высліцы», «Із-за Слуцка, із-за Клецка», «Ой калі-б, калі маскалі прышлі». Гэтыя песні напісаны на беларускай мове з некаторымі асаблівасцямі украінскай і рускай. Яны накіраваны супроць польскіх паноў, што здзекваліся з беларускага народа, яны выражаюць сабой магутны пратэст беларускага народа супроць гэтых каварных захватчыкаў.

У песні «Быў на Русі чорны бог», у першай частцы, даецца міфалагічны вобраз чорнага бога, пад якім разумеюцца наогул ворагі рускага і беларускага народа. А ў другой частцы гэтай песні мы маем рэальны паказ таго, як польскія паны Радзівілы здзекваліся з праваслаўнай веры, і страсны пратэст супроць гэтых здзекаў. Вось гэтыя радкі:

Аж ад ксяндза Радзівіла
Панайшла нячыста сіла,
Панайшла нячыста сіла —
Рускую веру паглуміла;
Бацькі ў царквы не служылі,
А ксяндзы імшу вапілі;
Нібыло к нам а ні слова
Ні із Слуцка, ні із Турова,
Нібыло ані славечка:
Юрый стаў блудна авечка.
Мы прэд Юрыем закленчам —
Штоб яго святая сіла
Паканала Радзівіла.

У песні «Із-за Слуцка, із-за Клецка» палякам выносіцца рашучы і катэгарычны праклён:

Дзень і ноч буду маліты,
Шчобы згінулі ляхі.

А ў гістарычнай народнай песні «Ой калі-б, калі маскалі прышлі» выражаны імкненні і мары беларускага народа да яднання з рускім народам і гарачы пратэст супроць палякаў, пад уладаю якіх знаходзілася Беларусь некалькі стагоддзяў. Вось высокамастацкія радкі гэтай песні:

Ой колыб, колы
Маскалі прышлі —
Нашы сродныя,
Нашы родныя —
Веры одныя!
Добра нам было
Счасна нам было.
Калі Русь уся,
Трымаючыся,
Аднэй сілаю,
За адно была.
Да й к нам за грахі
Панайшлі ляхі,
Занялі наш край
Аж да Ляхавіч...

А ў канцы гэтай песні, гэтак-жа як і ў вышэйадзначаных, польскім панам выносіцца праклён: «Ой, паны, шчоб вы згінулі!». Гэтыя песні доўгі час хадзілі ў рукапісах і былі надрукаваны ў фальклорных зборніках толькі ў канцы 30-х год XIX стагоддзя.

VI

Арыгінальнымі і цікавымі помнікамі беларускай пісьмовай літаратуры з'яўляюцца паэмы «Энэіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Гэтыя паэмы напісаны былі ў пачатку XIX стагоддзя. Аўтары іх невядомы. Доўгі час яны хадзілі ў рукапісах і толькі ў канцы XIX стагоддзя былі надрукаваны.

Цікавым момантам гэтых паэм з'яўляецца тое, што яны з'явіліся пэўнай рэакцыяй на паланізацыю, якую праводзілі і імкнуліся праводзіць польскія паны яшчэ і ў XIX стагоддзі. Гэтыя паэмы маюць значнае гістарычнае значэнне, таму што яны ўзніклі па аснове яднання і шчыльнага збліжэння беларускага народа з рускім і ўкраінскім, у шчыльнай сувязі з літаратурамі гэтых народаў.

Беларуская «Энэіда навыварат» магла з'явіцца таму, што ў другой палове XVIII стагоддзя была падрыхтавана пэўная глеба ў рускай літаратуры — «Энеидой, вывороченной наизнанку» Нікіты Осіпава, а ў украінскай «Энейдою» І. Катлярэўскага. Усе тры «Энэіды» маюць між сабой арганічную сувязь. На нашу «Энэіду» плодатворны ўплыў аказала руская і украінская. Але як украінская «Энейда», так і беларуская паэма не з'яўляюцца перакладнымі творамі. Усе яны з'яўляюцца арыгінальнымі творамі, не гледзячы на тое, што паміж імі ёсць шмат агульнага.

Усе тры «Энэіды» маюць сувязь з старажытнай рымскай і грэчаскай літаратурай, іх сюжэт будуецца на аснове сюжэта «Энэіды» рымскага паэта Віргілія. Вобразы багоў бяруцца часткаю з грэчаскай, а часткаю з рымскай міфалогіі. Але гэтыя вобразы нясуць зусім іншую ідэйна-паэтычную функцыю, тут кожны вобраз падаецца ў іранічна-сатырычным плане.

У паэме «Тарас на Парнасе» таксама выкарыстана міфалагічная сістэма персанажных вобразаў. Паэма «Тарас на Парнасе» па сваіх моўных асаблівасцях, па свайму паэтычнаму рытму, па сваёй мастацкай прастаце, сатырычнай завостранасці стаіць вышэй за «Энэіду навыварат». Тут адзін вобраз пададзены ў рэальным плане — гэта вобраз селяніна, панскага парабка, палясоўшчыка Тараса, вуснамі якога ў форме сказання разгортваецца апавяданне і вельмі ўдала ў сатырычна-гратэскным плане высмейваецца жыццё, густы і звычаі арыстакратычнай шляхты. Яна з'яўляецца такім чынам дэмакратычнай паэмай. Паэма «Тарас на Парнасе», па лёгкасці свайго верша, па прастаце і меладычнасці рытма, па яснай вобразнасці збліжаецца з рускай класічнай паэзіяй, асновапаложнікам і стваральнікам якой з'яўляецца геніяльны рускі паэт А. С. Пушкін.

У паэме «Тарас на Парнасе» ёсць месца, дзе саркастычна высмейваецца рэакцыянер і правакатар Булгарын, якога ў сваіх эпіграмах кляйміў ганьбай Пушкін. Вось радкі нашай паэмы, якія ва унісон гучаць пушкінскаму сарказму ў абмалёўцы Булгарына:

Гляджу, аж нехта сівы,
Кароткі, тоўсты як кабан,
Плюгавы, дужа некрасівы,
Крычыць як ашалелы пан.

Усё гэта і нават само параўнанне Булгарына з «ашалелым панам» — не выпадкова; яно сведчыць аб тым, што паэма «Тарас на Парнасе» накіравана супроць арыстакратычнай рэакцыйнай шляхты; яна звязана і ў некаторых момантах пераклікаецца з паэзіяй пушкінскай школы. Паэмы «Тарас на Парнасе» і «Энэіда навыварат» у гісторыі беларускай літаратуры першай паловы XIX стагоддзя маюць прагрэсіўнае значэнне, як першыя помнікі арыгінальнай пісьмовай літаратуры.

У парадку пастаноўкі пытання аб вывучэнні гісторыі старажытнай і пачатку новай (XIX стагоддзя) беларускай літаратуры мы на гэтым і спыняем наш беглы агляд. Якія вывады вынікаюць з гэтага?

Нашым крытыкам і навуковым работнікам — літаратарам трэба ўзяцца за навуковую распрацоўку пытанняў старажытнай, а таксама новай (XIX стагоддзя) беларускай літаратуры, якая не распрацавана і не вывучана. Трэба думаць, што ў архівах ёсць такія помнікі гэтай літаратуры, якія не былі яшчэ апублікаваны і нам невядомы, таму што беларускія нацыянал-фашысты свядома імкнуліся ўтоіць ад беларускага народа яго старую вусную народную творчасць і пісьмовую літаратуру, якая была накіравана супроць спрадвечных прыгнятальнікаў, польска-літоўскіх князёў, — літаратуру, якая гаварыла аб супольным змаганні рускага, украінскага і беларускага народаў супроць сваіх памешчыкаў і капіталістаў, а таксама супроць польска-літоўскіх паноў, нямецкіх рыцараў і іншых захватчыкаў, якія доўгі час прыгняталі наш народ.

Другое. У 30—40 гг. XIX стагоддзя дзейнічалі на Беларусі польскія рэакцыйна-нацыяналістычныя, прыгонніцкія пісьменнікі А. Рыпінскі, Ян Чачот і Баршчэўскі, якія ў сваім пісаніне імкнуліся апаляччыць беларускі народ, зноў далучыць Беларусь да панскай Польшчы. Нездарма беларускія нацыянал-фашысты імкнуліся ўзвесці гэтых бяздарных пісьменнікаў у асновапаложнікі беларускай літаратуры. Але былі ў нас такія пісьменнікі (не гаворачы ўжо пра народную творчасць), якія стварылі сваю паэзію, накіраваную супроць польскіх захватчыкаў і беларускіх памешчыкаў. З такіх пісьменнікаў нам вядомы толькі Паўлюк Бахрым. Трэба думаць, што ён быў не адзін. Апрача таго, мы маем багатую вусную народную творчасць. Гэтую творчасць трэба вывучаць сумесна з пісьмовай літаратурай таго часу.

Трэцяе. Трэба пераглядзець і пераацаніць творчасць старых пісьменнікаў — Дуніна-Марцінкевіча, Багушэвіча, Янкі Лучыны і іншых у напрамку таго, наколькі яны ў сваёй творчасці адстойвалі нацыянальную незалежнасць беларускага народа, арыентуючыся на родную нам рускую культуру і літаратуру. Гэтым самым мы высветлім значэнне творчасці беларускіх пісьменнікаў XIX стагоддзя.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Савецкая 68, Дом пісьменніка. Тэлефон сакратарыята 25-394, рэдактара 20-831. Уп. Галоўлітбела № 4178.